**Закон аб правілах беларускай арфаграфіі — у наступным нумары «Звязды»**

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 23 ліпеня г.г. падпісаў Закон Рэспублікі Беларусь «Аб правілах беларускай арфаграфіі і пунктуацыі». Тэкст закона будзе змешчаны ў поўным аб'ёме ў суботнім нумары «Звязды».



*Родная газета на роднай мове*

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

**25** ЛІПЕНЯ 2008 г. ПЯТНІЦА № 137 (26250)

Кошт 500 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.


## ЯКАСЦЬ — ТОЛЬКІ ВЫСОКАЯ

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка папярэдзіў кіраўнікоў аб жорсткай адказнасці за няякасную ўборку і несвоечасовую сяўбу. Ён азнаёміўся з ходам уборачных работ у Камянецкім раёне і ў Брэсцкай вобласці ў цэлым. Кіраўнік дзяржавы наведаў ААТ «Відамлянскае», агледзеў малочнатаварную ферму, аграгарадок, мехдвор.**

На яго думку, безгаспадарчы падыход да ўборкі і сяўбы з'яўляецца злачынствам.

«У канцы мінулага года я папярэдзіў, што ў гэтым годзе нікога вучыць не буду, і з партфелем не застанецца ніводзін, хто не будзе выконваць даручэнні. Кантроль якасці ўборкі — гэта пытанне нумар адзін. На фоне глабальнага харчовага крызісу, калі ў свеце назіраецца няхватка збожжа, злачынна страчваць хлеб», — заявіў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт падкрэсліў, што ў гэтым годзе ўвесь ураджай павінен быць убраны без страт. «Трэба падняць кожнае зярнятка. Недапушчальная ўборка спусціўшы рукавы, калі камбайнеры ганяцца за тым, каб намалаціць большы аб'ём», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы таксама звярнуў увагу на тое, што неабходна своечасова пачынаць сяўбу, для чаго павінны быць вызвалены і падрыхтаваны плошчы.

«Сёння калі купляць збожжа, а нам ўсё роўна нейкую колькасць давядзецца закупляць, — гэта дзікія цэны. Такіх грошай у нас няма, каб сёння не ўбраць збожжа, а потым выкідваць валюту. Гэта злачынства», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Сельскагаспадарчыя прадпрыемствы Беларусі павінны больш актыўна пераходзіць на выкарыстанне энерганасычанай тэхнікі. Такую задачу паставіў Аляксандр Лукашэнка.

Пры гэтым кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што такія высокапрадукцыйныя камбайны і трактары павінны выкарыстоўвацца максімальна эфектыўна. «Энерганасычаная тэхніка ні ў якім разе не павінна прастойваць. Трактар павінен працаваць не 8—10, а 18—20 гадзін, у дзве змены. Такім чынам, гаспадаркам спатрэбіцца менш адзінак тэхнікі», — адзначыў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка запатрабаваў забяспечыць на ўсіх мехдварах у краіне якасны рамонт і высокае тэхналагічнае абслугоўванне сельгастэхнікі. Пры гэтым кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу на тое, што пры добраўпарадкаванні мехдвароў, як і пры будаўніцтве малочнатаварных ферм, усё павінна быць выканана якасна і па тэхналогіі.

Малочнатаварныя фермы ў Беларусі павінны адпавядаць еўрапейскаму стандарту, заявіў Прэзідэнт Беларусі.

«Мы не дазволім нікому проста так «закопваць» грошы пры будаўніцтве фермаў. Аднак якасць тут павінна быць еўрапейская. Рабіце ўсё строга па тэхналогіі, у памяшканнях павінна быць чыста і акуратна. Неабходна прымяняць бязвыпаснае ўтрыманне жывёлы, забяспечваць двухгадовы запас кармоў», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Беларускі лідар таксама падкрэсліў, што рэканструкцыю старых і будаўніцтва новых 118 малочнатаварных фермаў у Беларусі неабходна завяршыць да кастрычніка 2009 года.

Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, неабходныя грошы будуць выдзелены, разам з тым Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання разам з кіраўнікамі на месцах павінны вызначыць, колькі фермаў будзе пабудавана і якога тыпу. «Самае галоўнае — узняць ферму на вышыню, будуйце і рэканструйце фермы, дзе гэта магчыма і неабходна, гаспадарчым спосабам», — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

Персанальную адказнасць за выкананне гэтага праекта і расходаванне сродкаў, што выдзяляюцца на гэтыя мэты, будзе несці прэм'ер-міністр Сяргей Сідорскі.

Сяргей Сідорскі, у сваю чаргу, звярнуў увагу на важнасць укаранення ў Беларусі рыначных механізмаў продажу лесу. Паводле яго слоў, цяпер выпрацоўваюцца рыначныя метады, цэны на лес плануецца каціраваць на біржы.

Плануецца, што 25 ліпеня Прэзідэнт заслухае справаздачу Брэсцкага аблвыканкама аб ходзе выканання Дзяржаўнай праграмы адраджэння і развіцця вёскі на 2005—2010 гады.

**БЕЛТА.**

## АБЯЗЗБРОІЦЬ... УСМЕШКАЙ



**24 ліпеня ў Брэсце ва ўрачыстых абставінах пагоны прапаршчыкаў атрымалі 96 выпускнікоў адзінага ў рэспубліцы цэнтра па падрыхтоўцы прапаршчыкаў органаў пагранічнай службы. Унікальнасць выпуску заключаецца ў тым, што 23 чалавекі — дзяўчаты. Ужо заўтра выпускнікі цэнтра падрыхтоўкі прапаршчыкаў раз'едуцца па ўсёй рэспубліцы і паступяць на службу.**

Фота Уладзіміра ЧАБЕРКУСА, БЕЛТА.

## Беларусь у поўным аб'ёме разлічылася за пастаўлены ў рэспубліку газ

**Аб гэтым паведаміў прэс-сакратар ААТ «Белтрансгаз» Уладзімір Чэкаў. «Па стане на 24 ліпеня запазычанасці за расійскі газ няма», — сказаў ён.**

Нагадаем, што ў ліпені паміж ААТ «Белтрансгаз» і ААТ «Газпрам» ішоў перагаворны працэс па плацяжах за газ. Так, 16 ліпеня ў Маскве намеснік старшыні праўлення ААТ «Газпрам» Аляксандр Ананенкаў на сустрэчы з гендырэктарам «Белтрансгаза» Уладзімірам Маёравым заявіў аб тым, што ў выпадку невыканання беларускім бокам абавязацельстваў па поўнай аплаце газу «Газпрам» пакідае за сабой права звярнуцца ў суд. У інтэрв'ю **БЕЛТА** 17 ліпеня, каментуючы гэтую сітуацыю, першы намеснік міністра энергетыкі Беларусі Эдуард Таўпянец пацвердзіў, што ў бакоў ізноў узніклі рознагалоссі ў пытаннях плацяжоў за газ. У той жа час ён выказаў упэўненасць, што гэтыя пытанні будуць урэгуляваныя і не адаб'юцца на стабільнасці пастаўвак газу ў рэспубліку.

## ЖНІВО НАБІРАЕ АБАРОТЫ

**Даводзіцца чуць, што гэты год самы гнілы за апошняе дзесяцігоддзе. Вось і ноччу 24 ліпеня грымела на ўсходзе Брэстчыны навальніца, але якім бы кепскім ні было надвор'е, убіраць ураджай трэба.**

Жніво ідзе вельмі павольна — гэта датычыцца найперш збожжа, бо, напрыклад, уборка рапсу па вобласці ўжо завяршаецца. У Бярозаўскім, Драгічынскім, Кобрынскім і Маларыцкім раёнах з рапсам, можна сказаць, пастаўлена кропка.

Так было заўсёды — на захадзе Брэстчыны жніво пачынаецца раней. А адстаюць гаспадаркі Баранавіцкага. Тут убрана ўсяго 30 працэнтаў ад пасеянага. Ураджайнасць рапсу хістаецца ад 20 ц/га ў Пінскім да 28,6 ц/га ў Бярозаўскім раёнах. Хоць у асобных гаспадарках рапсу намалочваюць і за 40 цэнтнераў. Нават Ганцавіцкі сельгаскааператыў «Агарэвічы» са сваім не надта багатымі землямі набірае ў бункеры па 38,2 ц/га.

Калі з рапсам карціна ясная, то са збожжам выснову яшчэ рабіць рана, бо жніво ў большасці раёнаў толькі набірае абароты. І зноў жа, Брэстчына і са збожжам падзелена на дзве зоны. На захадзе ўжо ўбрана пад 10 працэнтаў ад пасеянага, ва ўсходніх раёнах — у межах аднаго.

Што датычыцца ўраджайнасці, то яна значна вышэйшая, чым у мінулым годзе, але на пачатку жніва яно заўсёды так, пад канец уборкі «цэнтнеры» крыху падаюць.

Шэраг раёнаў узялі больш за 40 ц/га, а адарваўся Камянецкі — тут намалацілі па 43 цэнтнеры з гектара.

На сёння жніво затрымлівае найперш надвор'е: не дае магчымасць поўнасцю выкарыстоўваць тэхніку. Але надвор'е пакрысе наладжваецца.

Адносна нарыхтоўкі кармоў, то тут у параўнанні з 2007 годам вобласць мінусуе. Большасць раёнаў з сенам і сенажом адстаюць — мінулы год быў больш спрыяльны, і перш за ўсё па надвор'і. Але травы ўрадзілі добрыя.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

## Палажэнне аб дзяржрэгуляванні вытворчасці і абароту тытунёвых вырабаў у Беларусі дапоўнена новымі нормамі

Палажэнне аб дзяржаўным рэгуляванні вытворчасці, абароту і спажывання тытунёвай сыравіны і тытунёвых вырабаў дапоўнена новымі нормамі. Гэта прадугледжана Дэкрэтам № 16 «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у некаторыя дэкрэты Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь», які падпісаў кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка.

Дакумент прадугледжвае дапаўненне Палажэння аб дзяржаўным рэгуляванні вытворчасці, абароту і спажывання тытунёвай сыравіны і тытунёвых вырабаў, зацверджанага Дэкрэтам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 17 снежня 2002 года № 28, нормамі аб парадку маркіроўкі тытунёвых вырабаў, накіраваных у даход дзяржавы, спецыяльнымі маркамі. Адначасова ўстанаўліваецца, што тытунёвыя вырабы, прызначаныя для вывазу з тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, павінны маркіравацца іх вытворцам у адпаведнасці з патрабаваннямі заканадаўства краіны прызначэння да моманту іх адгрузкі з месца вытворчасці.

У дэкрэт уключана норма аб неабходнасці абавязковага суправаджэння тытунёвай сыравіны і тытунёвых вырабаў, якія перамяшчаюцца транзітам праз мытную тэрыторыю Беларусі.

Асобныя ўдакладненні таксама ўнесены ў Дэкрэт Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 9 верасня 2005 года № 11 «Аб удасканаленні дзяржаўнага рэгулявання вытворчасці, абароту і рэкламы алкагольнай, нехарчовай спіртазмяшчальнай прадукцыі і нехарчовага этылавага спірту».

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

Даслоўна

### Сяргей МАРТЫНАЎ: «Будучыня эканомікі Беларусі — за інавацыйнай і навукаёмістай прадукцыяй»

**Аб гэтым заявіў міністр замежных спраў Беларусі Сяргей Мартынаў, выступаючы на нарадзе з кіраўнікамі беларускіх загранустаноў, якая праходзіць у рамках штогадовай вучобы паслоў.**

Мэта нарады — прааналізаваць работу беларускіх загранустаноў за мінулы год і вызначыць перспектыўныя напрамкі дзейнасці. «Мы павінны грунтоўна абмеркаваць, што зроблена, што ўпусцілі, што трэба паправіць. Прагназуючы работу на перспектыву, неабходна ўлічыць, якія дадатковыя рычагі трэба задзейнічаць для выканання пастаўленых Прэзідэнтам Беларусі і ўрадам задач», — адзначыў міністр.

Ён дадаў, што ў час штогадовай вучобы дыпламаты мелі магчымасць сустрэцца непасрэдна з кіраўнікамі міністэрстваў і ведамстваў краіны, каб абмеркаваць існуючыя праблемы. Сяргей Мартынаў выказаў упэўненасць, што вучоба кіраўнікоў беларускіх загранустаноў прайшла эфектыўна і плённа.

**БЕЛТА.**

## Закупачныя цэны на жывёлагадоўчую прадукцыю павялічаны на 10 працэнтаў

**Закупачныя цэны на жывёлагадоўчую прадукцыю, у прыватнасці, на малако, буйную рагатую жывёлу і свіней, у Беларусі павялічаны на 10 працэнтаў з 22 ліпеня. Такое рашэнне змяшчаецца ў пастанове Савета Міністраў № 1061.**

Каментуючы па просьбе дакумент, начальнік галоўнага ўпраўлення эканомікі Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання Ганна Андрыевіч адзначыла, што павышэнне закупачных цэнаў на жывёлагадоўчую прадукцыю звязана з неабходнасцю пакрыцця затрат на яе вытворчасць і кампенсацыі ўзрослых цэнаў на матэрыяльныя рэсурсы, уключаючы паліва, угнаенні, кармы, збожжа, а таксама выраўноўвання цэнаў на аналагічную прадукцыю з суседнімі краінамі.

«Мы падрыхтавалі эканамічнае абгрунтаванне аб неабходнасці павелічэння закупачных цэнаў на жывёлагадоўчую прадукцыю і цяпер задаволены тым, што знайшлі ў гэтым пытанні ўзаемаразуменне з боку ўрада», — падкрэсліла спецыяліст. Згодна з разлікамі, дзякуючы павышэнню закупачных цэнаў на жывёлагадоўчую прадукцыю на 10 працэнтаў, сельгасарганізацыі атрымаюць да канца года Br200 млрд дадатковай выручкі.

Новае павышэнне закупачных цэнаў на жывёлагадоўчую прадукцыю запатрабуе таксама паэтапнага павышэння гранічных адпускных цэнаў на малочную і мясную прадукцыю. Аднак пакуль што гранічныя адпускныя цэны не павышаны. Паводле слоў спецыяліста, гэтыя затраты часткова будуць ускладзены на перапрацоўчыя прадпрыемствы.

Папярэдняе павышэнне закупачных цэнаў на жывёлагадоўчую прадукцыю было 25 лютага 2008 года: на малако — на 10 працэнтаў, буйную рагатую жывёлу — на 5 працэнтаў, свіней — у сярэднім на 4 працэнты. Адпускныя ж цэны на сацыяльна значную прадукцыю павялічваюцца нязначна і паэтапна. Так, з 3 сакавіка яны былі павялічаны на малочныя прадукты — на 2 працэнты, ялавічыну тушамі — на 1,5 працэнта і свініну тушамі — на 1 працэнт. З 11 чэрвеня 2008 года закупачныя цэны на БРЖ былі павышаны яшчэ на 10 працэнтаў.

**БЕЛТА.**

## Ствараецца інфармацыйны цэнтр па пытаннях развіцця ядзернай энергетыкі

**Аб гэтым паведаміў намеснік міністра інфармацыі Ігар Лапцёнак на пасяджэнні круглага стала «Забеспячэнне радыяцыйнай бяспекі насельніцтва Рэспублікі Беларусь пры будаўніцтве АЭС».**

Ён падкрэсліў, што сустрэчы вучоных і спецыялістаў з прадстаўнікамі СМІ для абмеркавання пытанняў ядзернай энергетыкі павінны стаць рэгулярнымі. Інфармаванасць насельніцтва па гэтай тэме пакуль што недастатковая. «Ядзерная энергетыка — вельмі складаная навука, і менавіта вучоныя і спецыялісты павінны растлумачваць насельніцтву гэтыя пытанні. Неабходны своеасаблівы лікбез па ядзернай праблематыцы», — лічыць намеснік міністра.

Сучасныя тэхналогіі прадугледжваюць зусім новы ўзровень бяспекі і надзейнасці атамнай станцыі, і неабходна больш шырока інфармаваць аб гэтым грамадскасць, падкрэсліў Ігар Лапцёнак.

**Мілена АНУФРЫЁНАК, БЕЛТА.**

### АМАЛЬ ПАЛОВА ЭКСПАРТУ — У ЕС

**Паводле апошніх звестак Мінэканомікі, Беларусь у студзені—маі гандлявала са 169 краінамі свету: рэспубліка пастаўляла тавары ў 125 дзяржаў, а імпартавала прадукцыю 155 краін.**

У пяцёрку асноўных гандлёвых партнёраў Беларусі ў гэты перыяд увайшлі Расія (49,3 працэнта ад усяго аб'ёму тавараабароту), Нідэрланды (9,4 працэнта), Украіна (7,1), Германія (4,6), Польшча (3,6). Што цікава, амаль палова ад нашага экспарту прыходзілася на долю ЕС — 45,5 працэнта, а імпартавалі мы найбольш з Расіі — 64,1 працэнта агульнага аб'ёму імпарту.

**Ігар ГРЫШЫН.**

### 4,5 КГ МАРЫХУАНЫ

**канфіскавана праваахоўнікамі ў 37-гадовага непрацуючага жыхара вёскі Пламя Сенненскага раёна.**

На «чорным» рынку за 5 грамаў высушанага «прадукту» даюць у сярэднім каля 10 долараў.

**Дзмітрый СТАНКОВІЧ.**

Разам з птушкамі

## МЫШАЛОВАЎ КАЛЬЦАВАЛІ

**Гродзенскія арнітолагі ўпершыню ў гэтым сезоне пачалі мечанне крылаў лугавых мышаловаў, паведаміў старшыня савета Гродзенскага аддзялення ГА «Ахова птушак Бацькаўшчыны» Дзмітрый Вінчэўскі.**

З сярэдзіны і да канца ліпеня, пакуль маладыя птушкі не навучыліся добра лятаць, гродзенскія арнітолагі займаюцца кальцаваннем і мечаннем крылаў лугавых мышалоў. «Праект па назіранні за лугавымі мышаловамі рэалізуецца сумесна з галандскімі арнітолагамі», — расказаў Дзмітрый Вінчэўскі. Для абазначэння птушак выкарыстоўваюцца пластыкавыя кольцы і пласціны для крылаў (або, як іх яшчэ называюць, крылаткі), 100 штук якіх перададзена галандскімі калегамі. Пластыкавыя каляровыя кольцы больш эфектыўныя за металічныя, якімі кальцавалі раней. Яшчэ больш рэзультатыўнае для назірання за птушкамі абазначэнне іх крылаткамі. «Прынцып дзеяння такі ж, але паколькі яны большага памеру, то атрымаць інфармацыю можна з больш далёкай адлегласці», — адзначыў Дзмітрый Вінчэўскі.

**БЕЛТА.**



Фота БЕЛТА.

## РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

### НАЛІЧАНАЯ СЯРЭДНЯЯ ЗАРПЛАТА РАБОТНІКАЎ У ЧЭРВЕНІ СКЛАЛА BR892 ТЫС. 423

**паведамілі ў Міністэрстве статыстыкі і аналізу. Гэты паказчык у маі быў роўны Br847 тыс. 008.**

Налічаная сярэдняя зарплата рабочых і служачых у чэрвені склала Br911 тыс. 265 (у маі яна была Br865 тыс. 850).

**БЕЛТА.**

### ЗЛОЎЖЫВАННЕ «ПАЦЯГНУЛА» НА 75 МЛН?..

**У дачыненні да галоўнага бухгалтара аднаго са сталічных прыватных унітарных прадпрыемстваў папярэднім расследаваннем Партызанскага РУУС узбуджана крымінальная справа.**

40-гадовая мінчанка падазраецца ў тым, што крыху больш як за год змагла незаконным шляхам істотна палепшыць сваё матэрыяльнае становішча. У прыватнасці, жанчыне інкрымінуецца крадзеж 75 мільёнаў 500 тысяч рублёў.

**Ігар ГРЫШЫН.**

### У ПЕРШАМАЙСКІМ РАЁНЕ НАРАДЗІЛАСЯ 14 ДВАЙНЯТ

**У Першамайскім раёне за шэсць месяцаў гэтага года нарадзілася 14 пар двайнятак. А вось з'яўленне на свет трайні пакуль зарэгістравана не было.**

Аб гэтым паведаміла начальнік аддзела ЗАГС адміністрацыі Першамайскага раёна Станіслава Макарэвіч. Усяго ж за ўказаны перыяд у сталічнай акрузе нарадзілася 1045 дзяцей, што на 67 больш, чым за першае паўгоддзе 2007 года. У большасці выпадкаў мамамі станавіліся 18—30-гадовыя мінчанкі. Мамам 15 малых — больш за 40 гадоў.

**Святлана ФРАЛЯНКОВА.** *«Мінск—Навіны».*

### У «БАМБІСТА» ЗАБРАЛІ САМАРОБКУ

**У Мінску ў 35-гадовага жыхара канфіскавана самаробнае выбуховае прыстасаванне.**

«Засвяціўся» раней судзімы за рабаўніцтва сталічны жыхар, калі гасцяваў на кватэры па праспекце Ракасоўскага ў раней неаднаразова судзімага мінчаніна: пад чаркай ён пагражаў узарваць кватэру гаспадара. Канфіскаваная ў «бамбіста» самаробка складалася з фрагменту тратылавай шашкі вагой 75,5 грама, капсуля-дэтанатара і вогнеправоднага шнура. У дачыненні да ўладальніка выбухованебяспечнай «цацкі» ўзбуджана крымінальная справа.

**Ігар ГРЫШЫН.**

### ПРАЗ ІНТЭРПОЛ ВЫШУКВАЮЦЦА 93 БЕЛАРУСЫ

**Камітэтам дзяржаўнай бяспекі Беларусі з шэрагам краін заключаны дамоўленасці аб невядзенні разведвальнай дзейнасці і іншых варожых мерапрыемстваў на тэрыторыі адзін аднаго.**

Аб гэтым паведаміў учора журналістам намеснік начальніка ўпраўлення прававога забеспячэння і міжнародных сувязяў КДБ краіны Уладзімір Твароўскі. Гэтыя дамоўленнасці сёння дзейнічаюць і цалкам выконваюцца, у першую чаргу беларускім бокам.

Намеснік начальніка Нацыянальнага цэнтральнага бюро Інтэрпола Беларусі Аляксандр Петран паведаміў, што па лініі НЦБ Інтэрпола ў Беларусі ў першым паўгоддзі сёлета было аб'яўлена ў міжнародны вышук 93 злачынцы. Усяго па краінах далёкага замежжа ў міжнародным вышуку знаходзяцца 667 чалавек. Сёлета з дапамогай міжнародных каналаў было выяўлена месцазнаходжанне 28 злачынцаў, якія зніклі з тэрыторыі нашай краіны. За гэты час з краін Еўрасаюза ў Беларусь было экстрадыравана 9 чалавек.

Паводле інфармацыі начальніка аддзела галоўнага ўпраўлення крымінальнага вышуку МУС Беларусі Віктара Юзэфовіча, за 6 месяцаў года на тэрыторыі краін СНД затрымана 263 чалавекі, якія абвінавачваюцца крымінальным вышукам нашай краіны. За гэты час з тэрыторыі краін СНД у Беларусь было экстрадыравана 105 чалавек. Увогуле органамі ўнутраных спраў Беларусі сёлета вёўся вышук 946 грамадзян, што зніклі без вестак за межамі краіны. Цяпер па гэтым спісе зніклых выяўлена месцазнаходжанне 192 чалавек.

**Сяргей ПАЛІНІН.**

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### РАСІЯ ПРЫДУМАЛА АДКАЗ НА ПРА: БАЛІСТЫЧНЫЯ РАКЕТЫ ПРЫЛЯЦЯЦЬ У ШТАТЫ ПРАЗ ПАЎДНЁВЫ ПОЛЮС



**Расія ў адказ на размяшчэнне ЗША трэцяга пазіцыйнага раёна супрацьракетнай абароны (ПРА) ва Ўсходняй Еўропе можа рэалізаваць праграму па стварэнні арбітальных балістычных ракет, цытуюць СМІ былога начальніка Галоўнага штаба Ракетных войскаў стратэгічнага прызначэння РФ, віцэ-прэзідэнта Акадэміі праблем бяспекі, абароны і правапарадку, генерал-палкоўніка Віктара Есіна.**

Паводле яго слоў, у адказ на дзеянні ЗША па размяшчэнні элементаў ПРА ва Ўсходняй Еўропе Расія можа распачаць тэхнічныя і ваенныя меры. «Напрыклад, можа быць рэалізаваная праграма па стварэнні арбітальных балістычных ракет, здольных дасягаць тэрыторыі ЗША праз Паўднёвы полюс у абыход амерыканскіх баз ПРА», — сказаў Есін. Ад такіх ракет у свой час Савецкі Саюз адмовіўся па Дамове СНВ-1.

### ДЭМАНСТРАНТЫ ЗАКІДАЛІ КАМЯНЯМІ НАТАЎСКІ ДЭСАНТ У КРЫМЕ

**Не менш за трыста чалавек правялі акцыю пратэсту падчас аднаго з этапаў вучэнняў «Сі Брыз 2008» у Крыме.**

Праціўнікі правядзення вучэнняў, у якіх удзельнічаюць вайсковыя падраздзяленні краін НАТА і Украіны, спрабавалі сарваць высаджванне дэсанта ў раёне возера Данузлаў на заходнім беразе Крыма. Яны зрабілі спробу абысці ачапленне па мелкаводдзі і пракрасціся ў раён вучэнняў. Пратэстанты кідалі ў вайскоўцаў камяні, у адказ на гэта быў адкрыты агонь у паветра. Паводле слоў кіраўніка прэс-службы МУС Аляксандра Дамброўскага, ні пацярпелых, ні затрыманых няма. Лідар аднаго з казачых аб'яднанняў Крыма Сяргей Юрчанка, які браў удзел у акцыі пратэсту, сцвярджае, што вайскоўцы ўжывалі супраць пратэстантаў шумавыя гранаты, а міліцыянеры збівалі жанчын, якія ўдзельнічалі ў акцыі.



### 77-ГАДОВЫ АСТРАНАЎТ: ЛЮДЗІ ЎСТУПАЛІ Ў КАНТАКТ З ПРЫШЭЛЬЦАМІ, АЛЕ ЗАМОЎЧВАЛІ ГЭТА 60 ГАДОЎ

**Іншапланецяне некалькі разоў уступалі ў кантакт з людзьмі, але ўрады хавалі праўду аб гэтым 60 гадоў, заявіў Эдгар Мітчал, шосты астранаўт, які высадзіўся на Месяц, паведамляе The Daily Mail.**

Нагадаем, у маі гэтага года Міністэрства абароны Вялікабрытаніі заявіла, што ўпершыню перадасць 160 дакументаў, у якіх распавядаюцца выпадкі кантактаў з НЛА, у Нацыянальны архіў. Такім чынам доступ да «сакрэтных матэрыялаў», у якіх паказаныя «рандэву» брытанцаў з НЛА, абяцалі адкрыць. У радыёінтэрв'ю Мітчал, якому цяпер 77 гадоў, паведаміў, што супрацоўнікі NASA, якія ўступалі ў кантакт з прышэльцамі, апісвалі іх як «маленькіх людзей, да дзівацтва падобных да нас».


**БЕЛИНВЕСТБАНК**

**СООБЩАЕТ**

**8 августа 2008 года в помещении Центрального банка по адресу: г. Минск, пр. Машерова, 29 в 11.00 проводится внеочередное общее собрание акционеров банка в заочной форме**

**В повестку дня собрания внесены следующие вопросы:**

1. О процедурных вопросах
2. Об оказании безвозмездной (спонсорской) помощи
3. О внесении изменений в Устав ОАО "Белинвестбанк"
4. Об утверждении Положения о Ревизионной комиссии Открытого акционерного общества «Белорусский банк развития и реконструкции «Белинвестбанк»

Лица, имеющие право на участие в собрании (владельцы простых (обыкновенных) акций ОАО «Белинвестбанк»), желающие принять в нем участие, могут обратиться за получением под роспись бюллетеней для голосования и иной информацией по месту нахождения банка (филиала, отделения) до 5 августа 2008 года включительно в рабочие дни с 9.00 до 12.00 и с 14.00 до 17.00.

**Адреса филиалов банка и телефоны для справок:**

г. Брест, ул. Советская, 50, тел./факс (8-0162) 23-08-36
г. Витебск, ул. Ленина, 22/16, тел./факс (8-0212) 29-75-46
г. Гомель, ул. Советская, 7, тел./факс (8-0232) 74-11-45
г. Гродно, ул. Мицкевича, 3, тел./факс (8-0152) 72-02-13
г. Минск, пр. Машерова, 29, тел. (8-017) 289-28-26, 334-45-98
г. Минск, ул. Коллекторная, 11, тел./факс (8-017) 217-30-66
г. Минск, ул. Мельникайте, 2, тел./факс (8-017) 203-93-96
г. Могилев, ул. Первомайская, 29-а, тел./факс (8-0222) 22-03-35

Заполненные бюллетени для голосования предоставляются Центральному банку по адресу: г. Минск, пр-т Машерова, 29, либо филиалам по вышеуказанным адресам до 5 августа 2008 года включительно.

**Правление ОАО «Белинвестбанк»**

*Открытое акционерное общество «Белорусский банк развития и реконструкции «Белинвестбанк», УНП 807000028*
*Лицензия на осуществление банковской деятельности Национального банка Республики Беларусь № 3 от 27.10.2006 г.*



**Сеницкий сельский исполнительный комитет Минского района (Продавец) совместно с КУП «Минский областной центр учета недвижимости»**

**ПРОВОДЯТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН**

по продаже земельного участка в частную собственность гражданам Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома по ул. Слуцкое шоссе в д. Сеница. Общая площадь участка 0,2500 га, кадастровый номер 623686605101000861. Начальная цена – 67 034 800 рублей. В непосредственной близости имеются сети электроснабжения, водоснабжения, газоснабжения, канализации. Победитель аукциона обязан в течение 10 рабочих дней после утверждения протокола о результатах аукциона внести плату за земельный участок, возместить расходы в сумме 1 358 770 рублей, связанные с подготовкой документации, необходимой для проведения аукциона. Задаток в размере 5 % от начальной цены земельного участка перечисляется на р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», г. Минск, МФО 153001357, УНП 690324015, КУП «Минский областной центр учета недвижимости». Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. **Аукцион состоится 02.09.2008 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 321.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 01.09.2008 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.

**Контактный телефон (8 017) 224 61 34.**
**Наш сайт в Интернете: www.rlt.by.**

КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015.


*Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 25.07.2008 г. (для б/н разлікаў)*

| | |
|---|---|
| 1 долар ЗША | 2 115,00 |
| 1 еўра | 3 313,36 |
| 1 латвійскі лат | 4 714,67 |
| 1 літоўскі літ | 959,64 |
| 1 чэшская крона | 139,88 |
| 1 польскі злоты | 1022,48 |
| 1 расійскі рубель | 90,47 |
| 1 украінская грыўня | 459,03 |

*Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў*

Цэнтрабанк РФ

| | |
|---|---|
| USD | 23,3782 |
| 10 UAH | 50,8498 |
| 1000 BYR | 11,0483 |
| EUR | 36,6664 |

*Курс у гандлёвых кампаніях (на 23.07.2008 г.)*

| | |
|---|---|
| USD | 2135 / 2210 |

Агенцтва Уладзіміра Граўцова


*Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2008 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.*
*ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009*



ISSN 1990 - 763X

# У Мінску павялічыцца колькасць часовых ахоўных аўтастаянак і тратуарных парковак

**У сталіцы вострa стаіць пытанне з паркоўкай і захоўваннем аўтамашын. Каб вырашыць гэтае пытанне, гарадскія ўлады і дзяржаўтаінспекцыя ствараюць сумесныя праекты. Так, было прынятае рашэнне аб будаўніцтве ў Мінску часовых ахоўных аўтастаянак і тратуарных парковак.**

«Дзяржаўтаінспекцыя заклапочаная праблемай няхваткі ў сталіцы аўтастаянак і парковак. Сёння ў Мінску зарэгістравана амаль паўмільёна адзінак асабістага легкавога аўтатранспарту. А месцамі на паркоўках, аўтастаянках, а таксама гаражамі забяспечаны толькі 31 працэнт аўтаўладальнікаў. Гэта вельмі мала, кажа **намеснік начальніка ўпраўлення ДАІ, начальнік аддзела арганізацыі дарожнага руху г. Мінска Канстанцін СТРАХ.**— Менавіта таму мы выступілі з ініцыятывай таго, каб ва ўсіх раёнах горада ў самых праблемных месцах былі пабудаваныя аўтастаянкі і тратуарныя паркоўкі. Плануецца, што ў хуткім часе ў сталіцы з'явіцца 185 парковак, на кожнай размесціцца 75—100 машын. Але гэта не вырашыць цалкам праблему. Да таго ж яшчэ не знойдзены грошы для рэалізацыі гэтага праекта».

Пакуль яшчэ невядома, колькі будзе каштаваць адна такая тратуарная паркоўка. Спецыяльна для гэтага трэба зрабіць карэкціроўку бюджэту горада. Калі хутка будуць знойдзены сродкі, рэалізаваць праект можна яшчэ сёлета. Гарадскія ўлады разлічваюць на дапамогу тых арганізацый і прадпрыемстваў, непадалёк ад якіх і будуць размешчаны тратуарныя паркоўкі. Таму цяпер ідзе актыўны пошук патэнцыяльных інвестараў. Дзяржаўтаінспекцыя выступае за тое, каб спрасціць працэс узгаднення і збору патрэбных дакументаў. Усё гэта робіцца для прыцягнення інвестараў.

«Многія прывыклі да таго, што можна ставіць машыны амаль усюды. Але гэта няправільны стэрэатып. Мы змагаемся з такімі парушэннямі. Некаторых проста папярэджваем. А бываюць такія сітуацыі, што даводзіцца выпісваць штраф або эвакуяваць транспарт. Але эвакуацыя — гэта апошні крок. Разумееце, у дварах можна пакінуць машыну толькі часова, напрыклад, у час абеду. А для пастаяннай паркоўкі адведзены спецыяльныя месцы, — тлумачыць Канстанцін Страх.

Паводле яго слоў, за дзень на ахоўную стаянку эвакуююцца некалькі дзесяткаў аўтамабіляў, якія былі няправільна прыпаркаваныя і заміналі руху транспарту і пешаходаў. А да адміністрацыйнай адказнасці кожны дзень прыцягваецца некалькі сотняў кіроўцаў, якія парушылі правілы прыпынку або стаянкі. Пакаранне за парушэнне правілаў паркоўкі ў Беларусі пакуль яшчэ не вельмі жорсткае. Магчыма, што менавіта таму ў Мінску столькі парушэнняў, звязаных з няправільнай паркоўкай.

**Сяргей ДЗЕВЯТОЎСКІ.**

# Шклоўская газетная папера з'явіцца ў найбліжэйшым месяцы

**У Шклове ў маі запрацаваў завод па вырабе газетнай паперы, аднак пакуль беларускія газеты не друкуюцца на шклоўскай паперы. Калі нарэшце спраўдзяцца планы? Ці хутка шклоўскае прадпрыемства запрацуе на поўную магутнасць? Пра гэта расказаў на прэс-канферэнцыі старшыня Магілёўскага аблвыканкама Барыс Батура.**

Ён найперш нагадаў, што гэты завод мае не толькі машыну па вырабе газетнай паперы, але і дадатковыя складаныя вытворчасці. Там ёсць яшчэ лесапільня і вытворчасць драўляных домікаў. Фактычна: тры заводы ў адным.

Тэхналогія вырабу газетнай паперы — унікальная і складаная, таму што ўпершыню ў краінах СНД папера будзе вырабляцца не з цэлюлозы, а з тэрмамеханічнай масы, якая ўтрымлівае толькі 10—15 працэнтаў цэлюлозы.

— Завод газетнай паперы ў стадыі наладкі, — паведаміў кіраўнік Магілёўскай вобласці. — Фірмы, якія пастаўлялі абсталяванне, сцвярджаюць, што патрэбен год для выхаду на праектную магутнасць у 40 тысяч тон паперы. Цяпер практычна ўсе пытанні зняты. Каб нарэшце атрымаць газетную паперу, павінен быць завершаны поўны цыкл адбельвання. Там ёсць складанасці ў тэхніцы бяспекі, бо падача хімікатаў — гэта выбухованебяспечны тэхналагічны працэс. І таму ёсць некаторая затрымка ў падрыхтоўцы кадраў.

Барыс Батура сказаў, што сама машына па вырабе газетнай паперы без адбельвання працуе ў нармальным рэжыме і на тых хуткасцях, якія даюць магчымасць рабіць газетную паперу. «Я мяркую, што ў найбліжэйшым месяцы з'явіцца адбеленая газетная папера, на якой вы будзеце друкаваць свае газеты», — запэўніў ён журналістаў.

Шклоўскі завод газетнай паперы даў гораду новыя працоўныя месцы — ужо цяпер там працуе 480 чалавек, развіваецца сацыяльная сфера — здадзены два новыя дамы і будуць будавацца наступныя.

Калі завод выйдзе на праектныя магутнасці, ён будзе рабіць значныя падатковыя адлічэнні ў бюджэт.

**Ілона ІВАНОВА.**

**Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказвае глыбокае спачуванне намесніку старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Чуйко Рыгору Пятровічу ў сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю МАЦІ.**

# КАГО НЕ БЯРУЦЬ У «ПАРТЫЗАНЫ»

**Самым маштабным для Ўзброеных Сілаў Беларусі ў гэтым годзе стане комплекснае аператыўнае вучэнне «Восень-2008», якое плануецца правесці з 15 па 21 кастрычніка. У ім будзе задзейнічана звыш 300 адзінак бранятанкавай тэхнікі, каля 40 артылерыйскіх гарматаў, самалёты і верталёты, возьме ўдзел каля васьмі з паловай тысяч чалавек. У тым ліку звыш дзвюх тысяч чалавек будзе прызвана з запасу. Так званыя «партызаны», безумоўна, ёсць і сярод чытачоў «Звязды», таму мы звярнуліся да прэс-службы Міністэрства абароны нашай краіны, каб высветліць: якія правы і абавязкі маюць «запаснікі», што пагражае ўхілістам?**



Фота БЕЛТА.

***За ўхіленне ад яўкі на зборы ваеннаабавязаны караецца штрафам ці выпраўленчымі работамі на тэрмін да аднаго года, ці арыштам на тэрмін да трох месяцаў***

У адпаведнасці з пастановай Савета Міністраў Беларусі № 78 «Аб зацвярджэнні Палажэння аб парадку праходжання ваенных і спецыяльных збораў» тэрмін праходжання ваеннаабавязанымі ваенных збораў можа дасягаць да 35 сутак. Паводле інфармацыі прэс-службы Міністэрства абароны краіны, ваеннаслужачыя, якіх прызавуць з запасу, будуць выконваць абавязкі ў складзе вайсковых часцей і падраздзяленняў на штатных воінскіх пасадах у залежнасці ад іх прызначэння. Удзел «партызанаў» — ваеннаслужачых запасу — у вучэннях (воінскіх зборах) вызначаны заканадаўствам Беларусі для таго, каб павысіць баявую і мабілізацыйную гатоўнасць Узброеных Сілаў краіны.

За час знаходжання на ваенных зборах ваеннаабавязаным (працуючым) выплачваецца сярэднямесячная зарплата па месцы працы. Прадпрымальнікам і беспрацоўным выплачваецца грашовая сума ў памеры 15 базавых велічынь у месяц (выплата ажыццяўляецца выканкамамі па месцы жыхарства). Аднак каб атрымаць грашовае забеспячэнне, патрэбна мець даведку аб колькасці дзён знаходжання на ваенных зборах (выдаецца ў ваенным камісарыяце). Акрамя таго, у вайсковай часці за час праходжання ваенных збораў выплачваецца грашовае забеспячэнне за тэрмін праходжання збораў (у залежнасці ад звання).

За ўхіленне ад яўкі на зборы ваеннаабавязаны караецца штрафам ці выпраўленчымі работамі на тэрмін да аднаго года, ці арыштам на тэрмін да трох месяцаў (арт. 436 УК РБ). Калі «партызан» будзе «касіць» шляхам нанясення сабе цялесных пашкоджанняў, сімуляцыі захворвання, ці падробкі дакументаў ці іншага падману, ён караецца штрафам альбо арыштам на тэрмін да шасці месяцаў, ці абмежаваннем волі на тэрмін да двух гадоў.

Ад правядзення ваенных збораў у адпаведнасці з артыкулам 71 Закона «Аб воінскім абавязку і воінскай службе» могуць быць вызваленыя наступныя катэгорыі грамадзян: ваеннаабавязаныя, забраніраваныя за рэспубліканскімі органамі дзяржаўнага кіравання, іншымі дзяржаўнымі органамі і іншымі арганізацыямі;

грамадзянскі персанал Узброеных Сілаў і іншых вайсковых фарміраванняў, органаў унутраных спраў, органаў фінансавых расследаванняў Камітэта дзяржаўнага кантролю Беларусі, органаў і падраздзяленняў па надзвычайных сітуацыях;

суддзі і пракурорскія работнікі;

дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі;

члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі;

кіраўнікі, асобы, з ліку лётнага і тэхнічнага складу, іншыя работнікі авіяцыйнага і чыгуначнага транспарту (метрапалітэна), якія непасрэдна забяспечваюць ці ажыццяўляюць перавозкі; занятыя абслугоўваннем і рамонтам самалётаў (верталётаў), аэрадромнай тэхнікі, рухомага саставу і абсталявання чыгуначнага транспарту (метрапалітэна), а таксама вучэбных авіяцыйных цэнтраў Беларускага абароннага спартыўна-тэхнічнага таварыства;

члены экіпажаў суднаў рачнога флоту — у перыяд навігацыі;

грамадзяне, непасрэдна занятыя на пасяўных і ўборачных работах, — на тэрмін правядзення гэтых работ;

работнікі жывёлагадоўчых комплексаў (фермаў);

педагагічныя работнікі ўстаноў, якія забяспечваюць атрыманне агульнай базавай, агульнай сярэдняй, прафесійна-тэхнічнай, сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыі, а таксама вучэбных цэнтраў дапрызыўнай падрыхтоўкі грамадзян;

работнікі Беларускага абароннага спартыўна-тэхнічнага таварыства, якія займаюцца падрыхтоўкай грамадзян да воінскай службы;

навучэнцы, студэнты ўстаноў, што забяспечваюць атрыманне сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыі, якія вучацца на вочнай форме навучання, — на ўвесь тэрмін навучання, а таксама навучэнцы і студэнты ўказаных устаноў адукацыі, якія вучацца на завочнай форме, — на тэрмін экзаменацыйных сесій;

ваеннаабавязаныя — пры наяўнасці ў іх падстаў адтэрміноўкі ад прызыву ў перыяд мабілізацыі па сямейных абставінах, стане здароўя, а таксама тыя, у каго ёсць трое і больш дзяцей да 18-гадовага ўзросту;

грамадзяне, звольненыя ў запас з воінскай службы, службы ў рэзерве, — на працягу двух гадоў са дня звальнення ў запас;

ваеннаабавязаныя жаночага полу.

У асобных выпадках пры наяўнасці сур'ёзных прычын і прад'яўляння адпаведных дакументаў рашэнне аб вызваленні ад праходжання ваенных і спецыяльных збораў можа быць прынятае ваеннымі камісарыятамі раёна (горада) па іншых падставах.

**ГЭТА ВАЖНА**

**Устаноўлены крайні ўзрост знаходжання ваеннаабавязаных у запасе:**

*для салдатаў і матросаў, сяржантаў і старшынаў, прапаршчыкаў і мічманаў — да 50 гадоў, для малодшых афіцэраў — да 55, маёраў, падпалкоўнікаў і палкоўнікаў — да 60, найвышэйшых афіцэраў — да 65 гадоў.*

*Грамадзяне, якія знаходзяцца ў запасе і дасягаюць крайняга ўзросту знаходжання ў запасе ці прызнаныя непрыдатнымі да воінскай службы са зняццем з воінскага ўліку па стане здароўя, пераво-дзяцца ваенным камісарыятам у адстаўку і здымаюцца з воінскага ўліку. З якой перыядычнасцю «партызанаў» прызываюць з запасу, залежыць ад тыпу збораў.*

**Ірына ПРЫМАК.**

# Хулігана — у бальніцу!

**Работнік аднаго з віцебскіх прадпрыемстваў 1974 года нараджэння прызнаны вінаватым ва ўчыненні грамадска-небяспечнага дзеяння ў адпаведнасці з часткай 3 арт. 339 Крымінальнага кодэкса (асабліва злоснае хуліганства). Прыгаворам суда да яго прыменены прымусовыя меры бяспекі і лячэння ў спецыялізаванай лячэбнай установе ва ўмовах строгага нагляду.**

3 лютага 2008 года малады чалавек прайшоў у агульную чытальную залу абласной бібліятэкі імя Леніна і папрасіў у служачай установы даведнік для тых, хто паступае ў ВНУ. Нечакана для ўсіх у момант, калі жанчына рабіла запіс у абанемент, ён выцягнуў раскладны нож і ўдарыў яе ў спіну. Пасля гэтага мужчына нават не зрабіў спробы ўцячы. Пацярпелая бібліятэкар 1976 года нараджэння была дастаўлена ў абласную клінічную бальніцу. Па выніках судова-псіхіятрычнай экспертызы было ўстаноўлена, што ў мужчыны цяжкае псіхічнае захворванне. Пры гэтым ён не стаяў на ўліку ў спецыялізаваных медыцынскіх установах. На працягу некалькіх гадоў малады чалавек з'яўляўся пастаянным чытачом бібліятэкі, у час наведвання якой ён і стаў выказваць знакі ўвагі да супрацоўніцы ўстановы, якая яму спадабалася. Не атрымліваючы ўзаемнасці, ён вырашыў такім чынам прыцягнуць яе ўвагу.

**Сяргей КОЧАТАЎ, БЕЛТА.**

# Найшла каса на... каноплі. І зламалася

**Не адна нават, а дзве. І было гэта ў Добрушскім раёне, у выселенай вёсцы ў выніку так званых чарнобыльскіх падзей. Тут, як паведаміў нам кіраўнік прэс-цэнтра УУС Гомельскага аблвыканкама Ігар Грышкевіч, была выяўлена плошча больш чым у адзін гектар, на якой раслі каноплі-дзікаркі, самасейкі. Іх вышыня была звыш двух метраў, бо выраслі на месцы былой жывёлагадоўчай фермы.**



«Плантацыя» гэта, як гаворыцца, выспела ўжо для таго, каб прымаць ахвотнікаў здабываць дурман. Таму міліцыя вырашыла знішчыць яе з дапамогай трактара з касілкай. Але гэту спецтэхніку выкарыстаць не ўдалося: перашкаджалі рэшткі бетонных пліт, камяні, цэгла, дошкі і да т.п.

Вось тады за справу ўзяўся асабовы склад міліцыі і ўзвод па ахове зонаў адсялення і адчужэння, пачаўшы «атаку» на каноплі з косамі. Але сцёблы канопляў былі такія тоўстыя і трывалыя, што косы ламаліся і тупіліся. Давялося хлопцам-малайцам выкарчоўваць каноплі з каранямі, прымяніўшы сваю сілу.

Як вядома, у рэспубліцы праводзіцца спецыяльная аперацыя «Мак», і на Гомельшчыне зафіксавана ўжо 102 факты незаконнага пасеву яго і канопляў на прысядзібных участках жыхароў. Гэта значна меней, чым за адпаведны перыяд мінулых гадоў. Прычына ў так званым абуджэнні свядомасці людзей, аб чым гаворыць і тое, што ў міліцыю паступаюць звесткі аб існуючых участках дзікарослага маку і канопляў.

**Уладзімір ПЕРНІКАЎ.**

## Абзац

■ **Колькасць платных аўтамабільных дарог у Беларусі можа павялічыцца, паведаміў учора на прэс-канферэнцыі начальнік аддзела развіцця дарожнай сеткі дэпартамента «Белаўтадар» Уладзімір Мардзіловіч. Па яго словах, разглядаецца пытанне аб магчымасці ўзымання платы па некаторых участках асноўных транзітных аўтамабільных дарог агульнай працягласцю каля 2,5—3 тыс. км. У іх ліку, напрыклад, могуць апынуцца ўчасткі дарогі накірункам Полацк—Віцебск і далей у Расію.**

■ Рэшткі маманта выяўленыя на будпляцоўцы па вуліцы Машынабудаўнікоў у Мінску. Яны знаходзіліся на глыбіні 4—7 метраў, у зямлі яго косткі праляжалі, па сцвярджэнні навукоўцаў, 20—40 тыс. гадоў. Знаходка будзе адпраўленая на экспертызу для далейшых даследаванняў.



■ **Адзіны ў Беларусі помнік яйку ўпрыгожвае тэрыторыю перад Салігорскай птушкафабрыкай, дзе занятыя вытворчасцю курыных і перапяліных яек пад брэндам «Маладзецкія». Аўтарам праекта і скульптарам стаў малады мастак з Салігорска Ўладзімір Ламейка. Надпіс на помніку сцвярджае: усё пачынаецца з яйка. Такім чынам аддадзена даніна павагі аднаму з прадуктаў, якім харчавалася чалавецтва на працягу амаль усяго свайго існавання.**

■ Мінскі міжгарнізонны суд прыгаварыў да 10 і 4 гадоў пазбаўлення волі двух былых афіцэраў Узброеных Сілаў Беларусі за злоўжыванне ўладай. Былы начальнік аддзела заказаў і паставак рэчавай маёмасці адной з баз захоўвання маёмасці падпалкоўнік прыгавораны да 10 гадоў пазбаўлення волі, былы начальнік аддзела рэчавага ўпраўлення Мінабароны палкоўнік — да 4 гадоў. Абодва за хабар садзейнічалі заключэнню нявыгадных для Мінабароны дагавораў на пастаўку маёмасці для патрэбаў арміі.

■ **На ўскраіне бразільскага горада Санту-Антоніу-ду-Монці сабака выратаваў кінутае немаўля. Ён знайшоў дзіця раніцай на гарадской пустцы. Малое ляжала ў кардоннай скрынцы. Сабака дацягнуў скрыню да тратуара і разбудзіў жыхароў прылеглых дамоў гучным трывожным брэхам. Па словах урачоў, якія прыбылі на месца здарэння, дзіця нарадзілася некалькі гадзін таму, бо на ім былі яшчэ свежыя сляды крыві. Сваімі дзеяннямі сабака выратаваў немаўляці жыццё. Сёння стан малога стабільны.**

■ Першая ў свеце гасцініца з пяску, што размешчана ў брытанскім графстве Дорсэт, прапануе начлег пад адкрытым небам усяго за 10 фунтаў стэрлінгаў. На пабудову незвычайнага гатэля, які нагадвае вялізны палац з дзіцячых казак, пайшла тысяча тон пяску. Яго пабудавала на паўднёвым узбярэжжы адна з гасцінічных фірмаў. На ўзвядзенні гатэля працавала каманда з 4 скульптараў, якая шчыравала па 14 гадзін у суткі на працягу тыдня. Койкі ў нумарах таксама зробленыя з пяску. Зручнасцяў не прадугледжана, даху таксама няма. Але затое можна прачнуцца ноччу і глядзець на зоркі. Калі, вядома ж, не ідзе дождж.

■ **Таямнічая валасатая істота, якую бачылі ў Лідскім раёне і якую да гэтага часу не ўдалося злавіць ці хоць бы добра пабачыць, можа аказацца, на думку некаторых біёлагаў, звычайным маладым мядзведзем. Падчас лінькі малады мядзведзь можа выглядаць менавіта так: брудна-рудая шэрсць, доўгія пярэднія лапы, рост у паўтара метра, а таксама манера лазіць па яблынях па плады. Але ўсё гэта, вядома, толькі меркаванні.**

## Поўны абзац

■ У Бразіліі 11-гадовы хлопчык укусіў сабаку пароды пітбуль, што напаў на яго. Хлопчык схапіў сабаку, што накінуўся на яго, за шыю і ўкусіў. У паядынку з байцоўскім сабакам дзіця зламала зуб і параніла руку, тым не менш яно засталося жывым. Пачуўшы крыкі, на дапамогу хлопчыку прыбегла брыгада будаўнікоў, што працавала непадалёк. Дарослыя абясшкодзілі жывёліну. Мужнасць, праяўленая малым, захавала яму жыццё.

■ **Таварыства абароны жывёлы ў амерыканскім штаце Аёва падало ў суд на мясцовую жыхарку, у доме якой было выяўлена больш за сотню кошак, а таксама янот і трус. Вобыск у яе доме быў праведзены пасля таго, як яе злавілі на крадзяжы кацінага корму ў мясцовай краме. Жанчына не першы раз мае непрыемнасці з законам. Раней тое ж таварыства забірала з яе дому каля 200 кошак. На гэты раз жанчына паспела прытуліць 117 жывёлін.**

***Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.***

**Ленинский сельсовет Чечерского района Гомельской области**

**ОБЪЯВЛЯЕТ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ**

по продаже в частную собственность земельного участка (кадастровый номер 325682200601000001) гражданам Республики Беларусь, расположенного по адресу: Гомельская область, Чечерский район, деревня Бердыж, 7А, площадь — 0,2499 га, под строительство и обслуживание жилого дома с ограничением в отношении жилого имущества, находящегося в прибрежных полосах. Аукцион состоится 27 августа 2008 года в 14.00 по адресу: здание сельсовета, ул. Луговая, 10, поселок Вознесенский Чечерского района Гомельской обл.
**Тел. для справок 8 02332 9 30 11, 8 029 113 58 43.** УНН 401150207

**Ивенецкий сельский исполнительный комитет Воложинского района Минской области (Продавец)**

**ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН**

по продаже 2 (двух) земельных участков для индивидуального жилищного строительства:

**Лот 1** — земельный участок № 1 в д. Рубеж Ивенецкого с/с, площадь участка 0,2500 га, начальная стоимость 3075000 белорусских рублей; **Лот 2** — земельный участок № 2 в д. Шикути Ивенецкого с/с, площадь участка 0,2500 га, начальная стоимость 2000000 белорусских рублей.

Целевое назначение земельных участков — строительство и обслуживание жилого дома. Имеется в непосредственной близости газ (д. Рубеж), река и лес. Продажа земельных участков производится гражданам Республики Беларусь, постоянно проживающим на территории республики или приравненным к постоянно проживающим в соответствии с законодательными актами Республики Беларусь. Задаток в размере 10 % от начальной цены перечисляется на р/с 3600614030057 в филиале № 605 МОУ «АСБ Беларусбанк» код 513, г. Воложин, ул. Партизанская, 13, назначение платежа 04901 УНП 600037397 ОКПО 04432334 Ивенецкий сельский исполнительный комитет. Оплата за объект аукциона должна быть осуществлена в течение 10 рабочих дней со дня получения протокола о результатах аукциона. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. **Аукцион состоится 29 августа 2008 г. в 15.00 по адресу: г.п. Ивенец, пл. Свободы, д. 2, 2 этаж — зал заседаний.** Заявления на участки и необходимые документы принимаются до 17.00 25 августа 2008 года по адресу: г.п. Ивенец, ул. 1 Мая, д. 13 (кабинет секретаря).

**Контактные телефоны (801772) 53388, 53587.**

УНП 600037397

**РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ» проводит аукцион по продаже объектов недвижимости**
**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ТОРГОВ**
**на открытом аукционе по продаже**
**объектов республиканской собственности 06 августа 2008 г.**

| № п/п | Наименование объекта (местонахождение объекта, общая площадь (кв. м) | Начальная цена продажи объекта (руб.) | Сумма задатка (руб.) | Площадь отчуждаемого участка (га) | Форма проведения торгов |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1. | Здание контрольно-технического пункта, в т. ч. мастерские (инв. № 5/306) с асфальтовым мощением (инв. № 306), в/г № 5 «Авиагородок», г. Бобруйск, 2 этажа; 177,0 м² | 83 500 000 | 8 350 000 | 0,0386 | Открытый аукцион |
| 2. | Здание неотапливаемого гаража (инв. № 5/305) с асфальтовым мощением (инв. № 305), в/г № 5 «Авиагородок», г. Бобруйск, 1196,0 м² | 160 000 000 | 16 000 000 | 0,2692 | Открытый аукцион |

**Тип помещений:** отдельно стоящие. **Форма проводимого аукциона:** без условий. Здания в аренде не находятся. Окончательное решение об отводе земли принимается местными органами власти.

Аукцион состоится в 11.30 06 августа 2008 г. по адресу: г. Минск, ул. Казинца, 2, РУП «Белспецконтракт».

Прием документов на участие в аукционе заканчивается в 17.00 04 августа 2008 г. по адресу: г. Минск, ул. Казинца, 2, комн. 604 РУП «Белспецконтракт».

К участию в аукционе допускаются покупатели, оплатившие задаток. Физические лица обязаны предоставить паспорт и заполнить необходимые документы установленного образца. Юридические лица предоставляют необходимый пакет документов.

**Победитель аукциона обязан:**

1. Заключить договор купли-продажи в день проведения аукциона.

2. Произвести оплату стоимости объекта платежами в течение 30-ти календарных дней со дня подписания договора купли-продажи.

Все денежные расчеты производятся путем перечисления их на расчетный счет РУП «Белспецконтракт»: 3012008660018 в Октябрьском отделении ОАО «БелПСБ» г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, код 357, УНП 101099370. **Без НДС.**

*По ранее проведенным торгам извещения публиковались в газетах: «Звязда» 6 сентября, 1 декабря, 20 декабря 2007 г.; «Коммерческий курьер» 18 июля 2007 г.*

Справки по тел.: (017) тел./факс 224 88 05.

***Наш адрес в Интернете: www.belspeckontrakt.com; e-mail: info@belspeckontrakt.com***

УНП 101099370

**ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ**

**(о проекте строительства жилого дома № 3 по г/п в жилой застройке квартала с объектами культурно-бытового назначения в границах улиц Янковского—Горецкого—Проектируемая)**

**Информация о застройщике:** Открытое акционерное общество «МАПИД», расположенное по адресу: г. Минск, ул. Р. Люксембург, 205, режим работы: понедельник—четверг — 8.30—17.30, пятница — 8.30—16.15, обед — 12.45—13.30.

Зарегистрировано в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 100008115 решением Мингорисполкома № 197 от 26.02.2001 г.

Сведения о проектах строительства жилых домов в г. Минске, в которых принимал участие застройщик в течение трех лет, предшествующих заключению договора:

| |
|---|
| 1. Жилой дом № 16 по ул. Алибегова |
| 2. Жилой дом № 10 по ул. Алибегова |
| 3. Жилой дом № 88А по ул. Рафиева |
| 4. Жилой дом № 79 по ул. Есенина |
| 5. Жилой дом № 19 по ул. Голубева |
| 6. Жилой дом № 21 по ул. Голубева |
| 7. Жилой дом № 123А по пр. Рокоссовского |
| 8. Жилой дом № 123Б по пр. Рокоссовского |
| 9. Жилой дом № 39 по ул. Гурского |
| 10. Жилой дом № 31, корп. 1 по ул. Лещинского |
| 11. Жилой дом № 31, корп. 2 по ул. Лещинского |
| 12. Жилой дом № 31, корп. 3 по ул. Лещинского |
| 13. Жилой дом № 64 по ул. Червякова |
| 14. Жилой дом № 32 по ул. Янковского |

Лицензия № 02250/0124979 на право осуществления деятельности «Проектирование и строительство зданий и сооружений I и II уровней ответственности и проведению инженерных изысканий для этих целей», выдана Министерством архитектуры и строительства Республики Беларусь на основании решения № 49 от 28.02.2005 г. и действительна до 28.02.2010 г.

**Информация о проекте строительства:**

1. Цель проекта — строительство многоквартирного жилого дома для работников ОАО «МАПИД», нуждающихся в улучшении жилищных условий.

Начало строительства — 2-й квартал 2008 г., окончание строительства — 1-й квартал 2009 г.

Положительные заключения государственной экспертизы № 2458-5/07 от 08.11.2007 г., государственной экологической экспертизы № 117 от 18.05.2007 г.

2. Местоположение строящегося многоквартирного жилого дома — г. Минск, жилая застройка квартала с объектами культурно-бытового назначения в границах улиц Янковского—Горецкого—Проектируемая, жилой дом № 3 по генплану.

**Характеристика объекта**

Объект — 131-квартирный, 19-этажный крупнопанельный жилой дом серии М-111-90 с помещением товарищества собственников.

Стены: наружные — железобетонные панели, внутренние — железобетонные панели.

Перегородки — железобетонные.

Перекрытия — железобетонные.

Крыша — мягкая рулонная.

Полы — линолеум, плитка.

Проемы: оконные — деревянные, дверные — щитовые.

Отопление — центральное.

Электроснабжение — скрытая проводка.

Наличие лоджий, водопровода, канализации, горячего водоснабжения, ванны и душа, электроплиты, радио, телевидения, мусоропровода, лифта — есть.

**Цены на объекты долевого строительства**

Стоимость 1 м² общей площади объекта долевого строительства на дату опубликования проектной декларации — 1 775 800 руб.

3. Права застройщика на земельный участок подтверждает решение Мингорисполкома № 124 от 25 января 2008 г. Собственник земельного участка — ОАО «МАПИД» (свидетельство о государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права на него от 12 июля 2006 г. № 500/116-1609). Границы участка проходят по улицам Янковского—Горецкого—Проектируемой, его площадь — 0,0815 га. Благоустройство — согласно проектной документации.

4. Количество квартир в доме — 131.

5. Нежилых помещений в многоквартирном жилом доме, не входящих в состав общего имущества, нет.

6. Состав общего имущества в многоквартирном жилом доме, которое будет находиться в общей долевой собственности:

Помещение товарищества собственников, межквартирные лестничные клетки, лестницы, лифты, лифтовые и иные шахты, коридоры, крыши, технические этажи и подвалы, другие места общего пользования, несущие, ограждающие ненесущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами или внутри жилых и (или) нежилых помещений, элементы озеленения и благоустройства, а также иные объекты недвижимости, служащие целевому использованию здания.

7. Предполагаемый ввод в эксплуатацию — 1 квартал 2009 г.

8. Строительство дома осуществляется застройщиком на основании решения Мингорисполкома № 1327 от 14 июня 2007 г., собственными силами без заключения договоров подряда, для состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий работников ОАО «МАПИД».

Условия ознакомления застройщиком дольщиков с объектом долевого строительства и ходом работ по строительству можно узнать по телефонам отдела инвестиций ОАО «МАПИД»: 207 19 15, 213 60 68, 207 16 73, 208 58 12.

УНП 100008115

**МОГИЛЕВСКИЙ ГОРОДСКОЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ**
**сообщает о проведении открытого аукциона по продаже земельных участков в частную собственность, который состоится 26 августа 2008 года**

в **16.00** по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, зал заседаний. Заявления и документы принимаются уполномоченной организацией (МГУКПП «Центр по землеустройству») по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, каб. 206 в рабочие дни с 08.00 до 17.00. Последний день приема заявлений – **20.08.2008** года до 17.00. Заключительная регистрация участников аукциона – **26.08.2008** года с 15.20 до 15.50 в каб. 206.

Продажа земельных участков производится гражданам Республики Беларусь.

Для участия в аукционе необходимо в сроки, указанные в извещении, предоставить в уполномоченную организацию следующие документы: а) заявление на участие; б) заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка на расчетный счет Могилевского городского исполнительного комитета № 3642017441709 в филиале 700 МОУ ОАО «АСБ Беларусбанк», код 536, УНП 700123787; в) документ, удостоверяющий личность (паспорт) покупателя или его доверенного лица; г) доверенность, удостоверенную нотариально, если в аукционе участвует представитель физического лица.

Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену.

Победитель аукциона обязан: оплатить в течение десяти рабочих дней после принятия решения о предоставлении земельного участка в частную собственность стоимость объекта аукциона; возместить затраты, связанные с подготовкой аукциона и документацией, необходимой для его проведения.

Всем желающим предоставляется возможность предварительного ознакомления с объектами.

Продажа земельных участков производится без изменения их целевого назначения.

Покупатель, желающий участвовать в торгах по нескольким лотам, вносит задаток в размере 10 % от начальной цены земельного участка с наибольшей стоимостью.

| № лота | Адрес земельного участка | Площадь, га | Кадастровый номер | Начальная цена (руб.) | Сумма задатка (руб.) |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | пер. 4-й Павлова, 9 | 0.1006 га | 740100000007004464 | 5 334 000 | 533 000 |
| 2 | пер. 4-й Павлова, 11 | 0.1006 га | 740100000007004423 | 4 673 000 | 467 000 |
| 3 | пер. 5-й Павлова, 1 | 0.1310 га | 740100000007004432 | 6 946 000 | 695 000 |
| 4 | пер. 5-й Павлова, 3 | 0.1267 га | 740100000001004537 | 6 718 000 | 672 000 |
| 5 | пер. 5-й Павлова, 5 | 0.1300 га | 740100000007004441 | 6 541 000 | 654 000 |
| 6 | пер. 5-й Павлова, 7 | 0.1300 га | 740100000007004445 | 6 038 000 | 604 000 |
| 7 | пер. 5-й Павлова, 10 | 0.1006 га | 740100000007004447 | 5 334 000 | 533 000 |
| 8 | пер. 5-й Павлова, 12 | 0.1006 га | 740100000007004448 | 4 673 000 | 467 000 |

Строений, сооружений и инженерных коммуникаций на земельных участках нет. Грунты подходят для малоэтажной застройки.

**Контактный телефон в г. Могилеве 22 11 63**

УНН 700008723

## ВІНДСЁРФІНГ НА МІНСКІМ МОРЫ

**Першы этап XI Кубка Беларускай асацыяцыі віндсёрфінга пройдзе з 25 па 27 ліпеня на Мінскім моры на воднаспартыўнай базе.**

Як паведаміла адказны сакратар асацыяцыі Святлана Халадзінская, 25 ліпеня адбудуцца спаборніцтвы сярод юных спартсменаў ва ўзросце 10—15 гадоў. Рабяты будуць пераадольваць кароткія і доўгія дыстанцыі на час. А 26 і 27 ліпеня выступяць наймацнейшыя віндсёрфінгісты краіны. Удзел у спаборніцтвах возьмуць больш за 50 спартсменаў.

**Надзея ІЛЬЯШУК, «Мінск—Навіны».**

## У ГРОДНЕ ЎСПЫХНУЎ СТАРЫ «МАСКВІЧ»

**22 ліпеня прыкладна ў 14.30 на стаянцы па Індурскай шашы г. Гродна ўспыхнуў стары аўтамабіль «Масквіч».**

Па выкліку на дапамогу прыбылі пажарныя-выратавальнікі. Праз некалькі хвілін пажар быў патушаны. Па папярэдняй версіі, пажар адбыўся ў выніку неасцярожнага абыходжання з агнём дзецьмі.

**БЕЛТА.**

Заснавальнікі — установа «Рэдакцыя газеты «Звязда» і грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Рэгістрацыйны № 12.

ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

25 ЛІПЕНЯ 2008 г.
ПЯТНІЦА
№ 29 (15533)

Размеркаванне

# ТВОРЧЫ ПАРАДАК

**Наўрад ці ў рэестры прафесій ёсць такая: «свабодны мастак». Заўсёды, калі чула гэтае спалучэнне, то са смехам узгадвала вядомую яшчэ са школы цытату Леніна пра свабоду мастака, пісьменніка, актрысы — у савецкім грамадстве і буржуазным. У нас ужо не першае, і яшчэ не другое. Можа таму апошнім часам ішлі спрэчкі наконт таго, каму патрэбныя свабодныя мастакі? Якая карысць ад іх працы грамадству? Гэта значыць мне. Я быццам бы не супраць: няхай малююць, што хочуць, а я потым прыйду і пагляджу. Дык, аказваецца, не так усё проста: а раптам яны не малююць у той час, калі ўсе людзі сумленна працуюць на патрэбы народнай гаспадаркі? А яшчэ вучыліся за дзяржаўны кошт... Непарадак.**

**Дзеля парадку, напэўна, маладыя мастакі з гэтага года павінны будуць адчуць сябе ў поўнай меры грамадзянамі сваёй краіны: пасля заканчэння Беларускай акадэміі мастацтваў яе выпускнікі ўпершыню за апошнія 10—15 гадоў паедуць працаваць згодна з размеркаваннем. Што гэта дасць ім і краіне? Гучалі дыяметральныя меркаванні на гэты конт. Але сёння пра будучыню сваіх выпускнікоў разважае дэкан мастацкага факультэта Уладзімір УРОДНІЧ:**

— Нашы выпускнікі будуць працаўладкаваныя, гэта плюс. А то атрымлівалася так: скончыў ВНУ — і працуй сам па сабе, калі хочаш. Але ў такім выпадку чалавеку ўвогуле працоўны стаж не ідзе. Малады мастак не можа мець пастаяннага месца працы, у яго няма працоўнай кніжкі, ён сацыяльна неабаронены. Якія правы маладога спецыяліста? Быццам бы правы ў яго ёсць, а па сутнасці іх няма.

Юрыдычная служба Міністэрства культуры сцвярджала, што па закону, калі нідзе не працуеш, то прыйдзі ў камітэт па сацабароне, заключы з імі пагадненне і кожны месяц прынось па 30 тысяч у пенсійны фонд. А дзе яны валяюцца гэтыя 30 тысяч? Іх жа яшчэ зарабіць трэба. Мы прапанавалі Міністэрству разам падумаць, дзе маладому мастаку ўзяць гэтыя грошы. У той жа сістэме Міністэрства культуры яны ёсць, калі разабрацца. Няхай заказала б яно што-небудзь маладым мастакам гады на два. Нас зразумелі. Для пачатку вырашылі ўзяць пяць чалавек у штат камбіната Саюза мастакоў, адкрыць працоўную кніжку, даць ім намінальны, няхай і не высокі, заробак. Гэтыя пяць месцаў сёлета атрымалі лепшыя студэнты.

**— Як яны вызначаліся?**

— Паводле рэйтынгу паспяваемасці. У першую пяцёрку патрапілі ў асноўным дзяўчаты-графікі, яны былі накіраваныя ў Саюз мастакоў. Акрамя таго, міністэрства нам дапамагло размеркаваць і іншых выпускнікоў. Сёлета мы на 19 чалавек атрымлі 35 заявак — ніколі такога не было. Таму што ўпраўленні культуры па краіне таксама вызначыліся ў патрэбах: аказалася шмат вакантных месцаў выкладчыкаў у школах мастацтваў. А каго ж браць на гэтую працу, калі не нашых выпускнікоў? У іх акрамя прафесіі мастака ў дыпломе ёсць запіс «педагог». Ёсць некалькі чалавек з ліку тых, каго мы размеркавалі, якія скарысталі сваё права і паступілі ў магістратуру. Згодна з законам іх работадаўцы абавязаны адпусціць.

**— Як успрынялі сваё размеркаванне тыя, хто паедзе ў рэгіёны?**

— Не магу сказаць, што энтузіязм быў відавочны. Але ў такіх выпадках звычайна гавораць: радзіма-маці кліча. Марына Юрчык едзе ў Салігорскую школу мастацтваў, Наташа Баранецкая ў Барысаўскую дзіцячую школу мастацтваў, Іна Мацвяйчук — дзіцячую мастацкую школу горада Оршы. Анджэй Трубіцкі будзе выкладаць ва ўніверсітэце ў Гродне. На яго персанальна прыйшло тры заяўкі — вельмі здольны чалавек. Усе, каго я назваў, прыехалі з тых рэгіёнаў, куды мы іх накіроўваем, у іх асаблівага напружання не было.

**— Чаму ўзнікла неабходнасць размяркоўваць мастакоў?**

— Быў прыняты дырэктыўны дакумент кіраўніцтва краіны, што падрыхтаваныя намі спецыялісты павінны быць размеркаваныя. Адбываецца канцэнтрацыя спецыялістаў, ім трэба знайсці прымяненне, каб людзі працавалі на патрэбы краіны. Толькі тут ёсць адно «але». Гэтая сістэма нам і падыходзіць, і не падыходзіць. Мы гаворым, што мастакі — гэта спецыялісты, якія маюць канчатковы прадукт сваёй дзейнасці: самі творы. Я разумею, што настаўнік ці іншы спецыяліст павінен працаваць з канкрэтнымі людзьмі на месцы. Мы ж гатовыя свой прадукт выканаць хоць на бязлюдным востраве і накіраваць яго ці то ў Касцюковічы, ці то ў Астравец, туды, дзе ён патрэбны. Калі ён патрэбны! І тут узнікае галоўнае для нас пытанне: разумення таго, што мастацкія творы патрэбныя ў любой прасторы экстэр'еру ці інтэр'еру. Трэба думаць пра напаўненне новых памяшканняў — у нас жа, куды ні глянь, будаўнічыя краны стаяць! А мы гаворым, што мастак пры гэтым не можа знайсці сабе месца і прыносіць карысць краіне. Дзяржаўны інтарэс не абстрактны, ён канкрэтны — і ў дачыненні да мастакоў. Проста яшчэ давядзецца ўсвядоміць, дзе і як можна паказаць мастацкія творы ў прасторы новых памяшканняў. А ў нас пакуль далёка не ўсе чыноўнікі разумеюць, навошта патрэбныя мастакі.

**— Не сакрэт, што кожны мастак перш за ўсё працуе на сваё імя.**

— Так, але вельмі важна, каб мастак як грамадзянін знаходзіў нейкае месца прывязкі ў сваёй айчыне. Возьмем да прыкладу мастака Пластава, вядомага савецкага жывапісца. У яго была вёска Прысланіха. У Вялянціна Сярова была вёсачка Даматканава. Наш Георгій Паплаўскі ездзіць на Браслаўшчыну. Многія нашы жывапісцы і манументалісты прывязаныя да сваіх каранёў. Добра, калі ў чалавека ёсць куточак, да якога ён прывязаны. Але гэта не азначае, што станоўчым момантам для яго стане абавязкова тое, што ён будзе працаваць толькі там. У любым выпадку ён будзе туды ездзіць. На мой погляд, прывязанасць мастака да роднай зямлі найлепш праявіцца тады, калі Айчына ў поўнай меры будзе выкарыстоўваць яго талент, а не дазволіць яму разняволіцца і сядзець склаўшы рукі. Уявіце сітуацыю: ідзе жніво, а некалькі камбайнаў пры гэтым стаяць. Гэта дапушчальна ў гаспадарцы?.. Так жа і з мастакамі — яны павінны займацца найперш сваёй справай. Я лічу, толькі дрэнны гаспадар не думае, як выціснуць максімум з таленавітага чалавека.

**— А чым кіраваліся, калі адмянялі размеркаванне?**

— Размеркаванне існавала ў Савецкім Саюзе, дзяржава рэгулявала магчымасці далучэння мастака да праблем народнай гаспадаркі. Не сакрэт, што Саюз мастакоў як арганізацыю, у якой канцэнтруюцца мастацкія кадры, прыдумаў Сталін і яго паплечнікі. Іншыя кіраўнікі працягвалі гэтую лінію. Бачыў асабіста дакумент, які падпісаны Касыгіным, старшынёй Савета Міністраў Саюза СССР, дзе прапісана, што ўся праца па эстэтызацыі асяроддзя павінна ажыццяўляцца праз Саюз мастакоў. Там канцэнтраваліся кадры, туды ішлі грошы, гэта быў свайго роду манапаліст. Узнікае пытанне: а што тут дрэннага? Ці мы задаём пытанне, чаму Міністэрства аховы здароўя з'яўляецца галоўным органам, які рэгулюе ўсе дзеянні ў гэтай сферы? Ці мы задаём пытанне, навошта нашы межы ахоўвае армія?.. Але ў 90-я гады ў нашай сферы адбыліся перамены, вынікам якіх стала і адмена размеркавання. У той час прынялі антыманапольны закон, чамусьці вырашылі, што пытаннямі мастацтва могуць займацца іншыя службы. Гэта вельмі дылетанцкія разважанні. Усё-такі мастаком так проста не станеш, акрамя таленту, яшчэ трэба вучыцца па 6—10 гадоў. Нашы выпускнікі — прафесіяналы. Раней прафесіяналізм вельмі цаніўся, а на прафесіяналаў быў попыт, які адпавядаў іх узроўню.

*(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)*



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Наш фармат

# «КІБЕРЫ» ПРАЙШЛІ ПЕРШЫ АДСЕЎ

**5 аўтобусаў з прадстаўнікамі Брэсцкай, Віцебскай, Гомельскай, Гродзенскай і Магілёўскай абласцей сустракаў днямі сталічны Палац культуры МТЗ. Унутры ж, у прасторным холе, ужо чакала гульцоў «арэна» — 115 гульнявых камп'ютараў, 10 плазменных панэляў, 2 праектары і 10 PC для дэманстрацыі найбольш цікавых матчаў. Менавіта тут стартаваў нацыянальны адбор на Сусветныя камп'ютарныя гульні (WCG-2008), што адбудуцца ў Кёльне.**



Адбор у Нацыянальны фінал, а затым і ў зборную Беларусі сёлета, нагадаем, праходзіць па чатырох дысцыплінах — ужо звыклых Counter-Strike 1.6, WarCraft III, FIFA 2008 (PC), а таксама новай кансольнай гульні-сімулятары Guitar Hero (XBOX 360).

Першымі ўдзел у кіберспартыўных спаборніцтвах узялі мінскія гульцы і каманды, на наступны дзень да іх далучыліся прадстаўнікі абласцей. На электронных гітарах спрабавалі «перайграць» сапернікаў 12 меламанаў. Значна большую цікавасць выклікала гульня Counter-Strike, для ўдзелу ў якой зарэгістраваліся 34 каманды, па 5 гульцоў у кожнай. Дарэчы, усяго ў гэтай дысцыпліне спаборнічалі 88 камандаў са сталіцы і рэгіёнаў. «Стратэгаў», больш схільных да дысцыпліны WarCraft, назбіралася 22 з Мінска і 74 — з рэгіёнаў.

І грымнуў бой... Праўда, зацяжных баталій не назіралася. Сярэдняя працягласць матчаў у розных дысцыплінах складала ад 10 хвілін да гадзіны ў WarCraft, 45 хвілін «перастрэлкі» ў Counter-Strike, паўгадзіны (2 матчы па 15 хвілін) паядынку ў FIFA 2008. Напрыканцы другога дня спаборніцтваў журы агучыла імёны фіналістаў: па 4 чалавекі ў FIFA 2008, WarCraft і Guitar Hero, і 7 камандаў — у дысцыпліне Counter-Strike. Менавіта ім давядзецца сысціся ў паядынках яшчэ раз — на Нацыянальным фінале, які адбудзецца 23—24 жніўня ў ГЦ «Сталіца». Як і летась, сцвярджаюць арганізатары турніру, арэна будзе адкрытая для балельшчыкаў, прадугледжана нават адмысловая глядацкая зала.

Беларусь возьме ўдзел у міжнародным чэмпіянаце па кіберспорце ўжо ў чацвёрты раз. На цяперашні час наша краіна займае 49-ю пазіцыю ў рэйтынгу з 72 краін-удзельніц. «Для нашай краіны ўдзел у WCG — прамы доказ сур'ёзнага развіцця кіберспорту, і шанц для гульцоў паспяхова заявіць пра беларускую магутнасць у сусветным асяродку кіберспартсменаў. Таму мы рады падтрымліваць новы перспектыўны спорт, які дорыць роўныя шанцы рэалізаваць сябе нават людзям з абмежаванымі фізічнымі магчымасцямі», — адзначае менеджар па інфармацыйных сістэмах прадстаўніцтва кампаніі Samsung Electronics у Беларусі Аляксей Голуб, арганізатар адбору ў нацыянальную зборную Беларусі да WCG-2008.

Акрамя таго, нагадаем, не хаваюць сваёй зацікаўленасці ў кіберспорце прадстаўнікі Міністэрства абароны краіны. Таму 23—24 жніўня, акрамя фінальных гульняў адбору на WCG, пройдзе міжнародны турнір па кіберспорце сярод віртуальных пілотаў з розных краін свету. Дэманстраваць майстэрства пілатажу, у адрозненне ад традыцыйных спаборніцтваў, будуць сквады (скарочаная форма слова «squadron» — эскадрылля) на камп'ютарным сімулятары «Іл-2 Штурмавік». Да ўдзелу ў фінальнай частцы спаборніцтваў будуць дапушчаныя 8 камандаў-пераможцаў адборачных гульняў, якія папярэдне (ліпень—жнівень) адбудуцца ў Інтэрнэце.

**Вікторыя ЗАХАРАВА.**

# У СТУДЭНЦКІМ БУДАЎНІЧЫМ АТРАДЗЕ — УСЁ ЛЕТА!



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.



**Да канца лета 33 студэнты з Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта і Мінскага фінансавага эканамічнага каледжа будуць працаваць на рэстаўрацыі і рэканструкцыі помніка архітэктуры — Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Беларусі.**

# Адзін дзень прыёмнай камісіі

## Як працуецца падчас уступнай кампаніі ў галоўнай ВНУ краіны, высвятляла наш карэспандэнт Настасся Занько

**Штолета ў БДУ арганізоўваюцца грамадскія прыёмныя камісіі са студэнтаў, у абавязкі якіх уваходзіць дапамога абітурыентам у напісанні заяў, запаўненні анкет. Такія камісіі створаны для паскарэння працэсу падачы дакументаў. Працуюць у іх студэнты розных факультэтаў БДУ.**

Дзень пачынаецца з вялікай чаргі ў фае ўніверсітэта. На гадзінніку 8.55. Абітурыенты нецярпліва пераступаюць з нагі на нагу, бацькі хвалююцца. Не паспяваю начапіць бэйдж, як перада мной ужо стаіць дзяўчына з акуратна складзенымі дакументамі ў файліку.

Сёлета 120 студэнтаў працуюць у грамадскай прыёмнай камісіі БДУ. І прыкладна 7000 абітурыентаў чакаецца ў галоўнай ВНУ краіны. Кожны, такім чынам, за ўсю прыёмную кампанію (з 12 па 23 ліпеня) павінен аформіць 58 чалавек, прыкладна па 6 заяў-анкет у дзень. Калі б чалавечая прырода падпарадкоўвалася матэматыцы, то так бы і было. Але ў першыя дні абітурыенты не спяшаліся несці дакументы. Нягледзячы на тое, што БДУ замест трэцяга экзамена прымаў сертыфікаты ЦТ. Засталіся толькі экзамены кшталту «творчасць» для дызайнераў і журналістаў, беларуская і руская літаратура для пэўных філалагічных спецыяльнасцяў, біблейская гісторыя для тэолагаў, тэорыя права, канстытуцыйнае і адміністрацыйнае, грамадзянскае і крымінальнае права для выпускнікоў юрыдычнага каледжа БДУ. У першыя дні прыходзілі абітурыенты, якія маюць права паступаць без экзаменаў альбо ідуць па-за конкурсам: дыпламанты рэспубліканскіх прадметных алімпіяд, дзеці-сіроты і асобы, што засталіся без апекі бацькоў.Таксама падцягваліся і тыя, хто меў даволі высокія балы па тэстах (ад 80 і вышэй). А таксама прыходзіла шмат людзей з невысокімі баламі (40 і менш).

...Дзяўчына з файлікам сядае перада мной і адразу ж пытаецца, ці вядомы прахадны бал і конкурс. Гэта ўжо трэці чалавек за дзень з такім пытаннем. Цярпліва пачынаю тлумачыць, што прамежкавыя вынікі можна паглядзець на стэндзе, які абнаўляецца кожныя тры гадзіны, а прахадны бал стане вядомым толькі пасля таго, як усе абітурыенты пададуць дакументы. Адны з самых частых пытанняў — тэрміны падачы дакументаў і залічэння, магчымасць паступлення на завочную і платную формы, а таксама кошт навучання. Уся падрабязная інфармацыя ёсць на стэндах, сайце БДУ, але гэта не змяншае колькасць пытанняў.

Наступная дзяўчына падыходзіць з мамай. Яны разам сядаюць каля мяне і мама пачынае дыктаваць дачцэ, што і як пісаць. Дзяўчынка хвалюецца, псуе заяву, маці на яе крычыць, абое нервуюцца і як вынік — часу патрачана ўдвая болей. Бацькоў падчас афармлення дакументаў у залу перасталі пускаць, практыка паказвае, што гэта станоўча адбіваецца як на саміх бацьках, так і на іх дзецях. Часцей абітурыент нашмат спакайнейшы, чым яго ныя родзічы.

Адзін з абітурыентаў доўга выбірае спецыялізацыю на механіка-матэматычным факультэце. На кансультацыю я клічу хлопца, што сядзіць каля мяне, Сашу. Саша, студэнт мехмата, падрабязна расказвае пра спецыфіку навучання на іх факультэце. Гэтым і адметная грамадская прыёмная камісія. Тут працуюць людзі амаль з усіх факультэтаў БДУ. Таму, калі толькі ўзнікаюць нейкія пытанні па спецыяльнасцях ці факультэтах, адразу знаходзіцца чалавек, якому можна задаць пытанні.

У больш складаных выпадках можна пракансультавацца са старшынёй грамадскай прыёмнай камісіі Міхаілам Радзько альбо адказным сакратаром прыёмнай камісіі Людмілай Хухлындзіной ці нават з юрыстам БДУ.

Хлопец, прысаджваючыся насупраць мяне, адразу шчыра запытаў: «Дзяўчына, скажыце, а я праўда паступлю?». На мой адказ — не ведаю, ён уздыхнуў, што ў выпадку непаступлення будзе канец жыцця. «Не будзе», — супакойваю. «Будзе. Не паступлю — армія. А гэта і ёсць канец жыцця», — зрабіў заключэнне юнак.

«На канверце так і пісаць: «каму?», — пытаецца дзяўчына. Не разумеючы, я перапытваю. «Ну, а каму тады гэты ліст прыйдзе?» — фраза ставіць у тупік. Адметнасць сённяшніх абітурыентаў яшчэ і ў тым, што яны развучыліся пісаць звычайныя лісты, таму пытанне пра адрас і індэкс часам становіцца даволі складаным. «Электронная пошта ёсць, навошта звычайная», — паціснуў плячыма адзін з абітурыентаў.

Дзяўчына з Магілёўскай вобласці вырашыла паступаць на факультэт журналістыкі, аднак не праходзіла прафесійна-псіхалагічнае тэставанне. Без рэкамендацыі на выбраную спецыялізацыю прыняць яе дакументы я не маю права. Пытанне «дзе яго можна прайсці?» павісае ў паветры. Я тлумачу, што гэта трэба было рабіць у красавіку. Дакументы асабіста да мяне прынасілі 3 такія чалавекі. Людзі не ведалі што за тэставанне такое, калі і для каго яно праводзілася.

Тыповыя сітуацыі, калі абітурыенты забываюць дома атэстаты, меддаведкі, сертыфікаты. Прыняць у гэтым выпадку іх дакументы немагчыма. Грамадскую прыёмную камісію правярае дзяржкантроль, які працуе падчас уступнай кампаніі ў БДУ. Таму на ўсе просьбы прыняць толькі частку дакументаў адказ адмоўны.

Кожны мой дзень заканчваецца прыкладна аднолькава. Марыць сысці раней і абавязковы абітурыент у 17.50. Каля ўваходу — вялікі натоўп: выпускнікі і іх бацькі гладзяць змяненні ў конкурсе і балах за дзень. Каб калі што, «перападаць» дакументы на іншы факультэт. Усхваляваныя вочы, запісныя кніжкі ў руках і спроба прадказаць заўтра — апошняе, што за дзень бачыш у прыёмнай камісіі.

# «Калі сустрэць няшчасце ўсмешкай, то яно, плачучы, уцячэ ад цябе...»

У сонечным балгарскім горадзе Балчык праводзіўся сёмы Міжнародны дзіцячы фестываль «Усмешкі Мора». Гэтая падзея стала сапраўдным святам для нашай краіны, бо ўпершыню сярод удзельнікаў конкурсу быў прадстаўлены і беларускі кандыдат — чатырнаццацігадовая выхаванка Імідж-дызайн студыі «Вадалея» Настасся Гамолка.

*(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)*



# МАЛАДЗЁЖНЫ ЛАГЕР «БЕ-LA-РУСЬ» ЗБІРАЕ СЯБРОЎ



**У Верхнядзвінскім раёне, на мяжы трох дзяржаў — Беларусі, Расіі і Латвіі — учора адкрыўся 17-ы Міжнародны маладзёжны лагер «Бе-La-Русь». Гэта мерапрыемства стала ўжо традыцыйным. Яго нязменныя арганізатары — Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі, Расійскі саюз моладзі і Саюз моладзі за прагрэс Латвіі.**

Кожны год «гаспадыняй» лагера становіцца адна з маладзёжных арганізацый, што дазваляе ўносіць новаўвядзенні і цікавыя ідэі ў праграму. Сёлета — гэта Расія. Расіяне прапанавалі тэматыку лагера, якая звязана з правядзеннем у горадзе Сочы «Алімпіяды-2014». Як сказаў нам **другі сакратар ЦК БРСМ Міхаіл ДЗЕНІСЕНКА**, беларуская моладзь з ахвотай падтрымала гэту ідэю, тым больш што 2008 год праходзіць у нашай краіне пад знакам Года здароўя. Такім чынам, тэматыка сёлетняга міжнароднага маладзёжнага лагера «Бе-La-Русь» — алімпійская вёска. І таму ўсе лагеры моладзі трох дзяржаў (а сёлета свята маладосці аб'яднала 600 чалавек) афармлены ў выглядзе невялікай алімпійскай вёскі. Акрамя таго, маладых і ініцыятыўных чакае насычаная спартыўная праграма: спаборніцтвы па футболе, валейболе, перацяганні каната, армрэстлінгу і шмат чаго іншага. Не менш цікавая і культурная праграма. Праявіць фантазію і арыгінальнасць можна ў песенным конкурсе «Бе-La-Рускія зоры», конкурсе бівакаў (алімпійскіх дамоў), праграмах «Лепшая пара «Бе-La-Русь-2008», дыскатэцы «Бітва DJ», конкурсе малюнкаў на асфальце «О спорт, ты — жыццё!», конкурсе лепшых фотаздымкаў лагера «Фота-крос» і гэтак далей, пералічыць усё проста немагчыма.

— Маладзёжны лагер «Бе-La-Русь» сёлета праходзіць 17-ы раз, і за гады яго існавання ні разу не было перапынку. А гэта гаворыць аб запатрабаванасці яго ў моладзі, — адзначыў Міхаіл Дзенісенка. — Неабходна прыгадаць, што ён праходзіць на свяшчэнным для народаў трох краін месцы: Курган Дружбы быў узведзены на месцы інтэрнацыянальнай барацьбы з фашысцкімі акупантамі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Яго адкрыццё адбылося 3 ліпеня 1959 года. Ад Кургана пракладзены тры алеі: у бок Беларусі высаджаны бярозы, Расіі — клёны, Латвіі — ліпы. На вяршыні Кургана расце дуб, які сімвалізуе добрасуседскія адносіны трох народаў. У найменні лагера, якое складаецца з першых складоў назваў трох дзяржаў, таксама закладзена ідэя адзінства моладзі нашых краін. А заўтра, 26 ліпеня, ля Кургана Дружбы пройдзе сустрэча моладзі з ветэранамі Вялікай Айчыннай вайны. У праграме сустрэчы наведванне вызваліцелямі дэлегацый трох краін, урачысты мітынг і ўскладанне кветак да падножжа Кургана. Гэта ўсё — доказ таго, што моладзь неабыякавая да гісторыі сваіх народаў.

У лагера «Бе-La-Русь», вядома, ёсць свае традыцыі. У прыватнасці, неабходна ўзгадаць рытуал «баявога хрышчэння» навічкоў дубовымі галінамі і ўзнагароджанне ветэранаў, перадачу галоўнага сімвала — дубовай галінкі — прадстаўнікам боку, які будзе арганізатарам лагера ў наступным годзе.

І гэта толькі малая частка таго, што запланавана для маладых людзей падчас Міжнароднага маладзёжнага лагера «Бе-La-Русь». Чатыры дні і тры ночы правядуць юнакі і дзяўчаты ў Верхнядзвінскім раёне Віцебскай вобласці, дзе іх чакаюць самыя разнастайныя мерапрыемствы і конкурсы. Увесь гэты час яны будуць жыць у палатках, адпачываць ля вогнішча, удзельнічаць у спартыўных і творчых конкурсах, танцаваць на дыскатэцы і, самае галоўнае, заводзіць новых сяброў. Астатнім застаецца толькі пазайздросціць тым, каму пашчасціла стаць самым актыўным удзельнікам маладзёжнага лагера «Бе-La-Русь». Паводле слоў Міхаіла Дзенісенкі, такія мерапрыемствы даюць маладым людзям зарад бадзёрасці і яшчэ больш умацоўваюць дружбу юнакоў і дзяўчат Беларусі, Расіі і Латвіі. І, вядома, у маладзёжных арганізацый ёсць магчымасць абмяняцца вопытам і напрацоўкамі.

**Святлана СУХАРКО.**





Фота з сайта www.brsm.by.

Размеркаванне

# ТВОРЧЫ ПАРАДАК

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

***— Ці будзе магчымасць займацца сваёй творчасцю ў тых, хто паедзе згодна з размеркаваннем?***

— Калі мы іх праводзілі ў жыццё, то вялі гаворку пра гэта. Мне, напрыклад, жыццё не дало магчымасці з першага дня займацца чыстай творчасцю. Я стаў зарабляць кавалак хлеба для сябе і для сям'і. Але кожны дзень я трымаў у руцэ пэндзаль. У любых абставінах трэба думаць пра ўласнае самаўдасканаленне. Гісторыя толькі па творчай працы прымае мастака.

***— Як вы думаеце, хто з вашых сённяшніх выпускнікоў здолее ўвайсці ў гісторыю?***

— На пачатковым шляху вельмі цяжка вызначыць, што потым у жыцці адбудзецца з чалавекам. Бліскуча чалавек заканчвае навучальную ўстанову, выходзіць у свет і губляецца, забывае пра сваю прафесію. А бывае наадварот — ледзь скончыў ВНУ, а потым этап за этапам фарміруецца асоба і праяўляе сябе ў тым ці іншым сектары мастацтва. Многія з нашых выпускнікоў ніколі не займаліся ні тэатральнай справай, ні кіно. А раптам Дзіма Мохаў становіцца адным з вядучых мастакоў кіно. Зіновій Марголін становіцца знакамітым не толькі ў нашай краіне сцэнографам. Ці Веня Маршак, які вучыўся як дызайнер, становіцца мастаком розных святаў і паказаў.

Асабіста я чакаю, што з гэтага выпуску заявіць пра сябе Анджай Трубіцкі. Ён добра маляваў, прафесійна выконваў усе заданні. А гэта школа. Мы вучым людзей мысленню і добраму майстэрству, прычым вучым, арыентуючыся не толькі на асабістую практыку, але і на прыклады рускага мастацтва, сусветнай класікі. Але ў таго, хто мае яшчэ галаву і нармальнае бачанне, пастаўленае вока, усё ў творчасці вырашаецца. Дзяўчаты, якія вучыліся на графічным аддзяленні, таксама таленавітыя асобы.

***— Былі выпускі, якія самі выжывалі без размеркавання. З якімі праблемамі яны сутыкаліся?***

— Мы ў ВНУ прымушаем чалавека штодзённа выконваць нейкі аб'ём працы. Ён прывыкае да пэўнага рэжыму. І калі выходзіць, то павінен працаваць у сваім рытме, і добра, калі нехта ў гэтым яму дапамагае — ён жа робіць гэта не для сябе, а разлічваючы на нейкага спажыўца. А хто спажывец? Людзі, якія валодаюць грашыма, якія адказваюць за фарміраванне і афармленне прасторы, на жаль, аказваюцца ў баку ад мастацкага працэсу. Не многія выпускнікі апошніх гадоў праявілі сябе. Ім не дапамаглі гэта зрабіць. Нейкім выйсцем былі б конкурсы для маладых мастакоў на тую ці іншую тэму. Яны маглі б спрыяць вырашэнню нейкіх дзяржаўных інтарэсаў і адначасова падтрымаць маладых творцаў фінансава, чаго тут хаваць. І дзяржава атрымала б нейкі прадукт. Апошнім часам перасталі ўсведамляць, што культура — частка ідэалогіі, а людзі культуры — яе інструменты. Дык чаму імі не карыстаюцца ў поўнай меры? Я гэтую ідэалогію для сябе вельмі проста разумею. Сёння няма партыйных інтарэсаў, але ёсць нейкая супольнасць людзей са сваімі традыцыямі, гісторыяй, каранямі, ёсць краіна, дзе жыве вельмі гасцінны народ. Вось як бы нам у пагоні за нейкімі звышзадачамі свой уласны партрэт не страціць. А хто будзе яго маляваць далей? Мяне турбуе, што занятасць для мастакоў сёння ствараецца толькі на ўзроўні выкладчыцкай дзейнасці. Мы кажам пра запатрабаванасць. Але гэта вельмі слізкае паняцце. Сярод людзей могуць быць запатрабаваныя не вельмі добрыя рэчы — наркотыкі ці прастытуцыя. Ці заўсёды варта думаць пра запатрабаванасць? Я хачу, каб мая айчына адчувала сапраўдную патрэбу ў мастацкім прадукце, які мы б стваралі для яе — ці гісторыю адлюстроўвалі, ці выказваліся па праблемах сённяшняга дня. Гэта тое, што рабіла нашых папярэднікаў вялікімі творцамі.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

# КАЛІ ДЗІЦЯ ІДЗЕ Ў САДОК



Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.

**Лета — складаная пара не толькі для абітурыентаў, але для тат і мам дашкольнікаў. Традыцыйна ў гэты час бацькі «неарганізаваных» трохгодак пачынаюць вырашаць пытанні «Куды аддаць дзіця?», «Які садок лепшы?» і «Як знайсці свайго выхавальніка?». Некаторыя наведваюць Інтэрнэт-сайты, іншыя раяцца з тымі, хто ўжо вызначыўся, а хтосьці прыслухоўваецца да размоў мам, якія сядзяць каля пясочніц.**

**Усяго ў Беларусі функцыянуе 4 тыс. 106 дашкольных устаноў, больш за 366 тыс. дзяцей атрымліваюць тут адукацыйныя паслугі. Аб беларускай мадэлі адаптацыйнага пераходу дзіцяці з сям'і ў дзіцячы садок нам расказала начальнік упраўлення дашкольнай адукацыі Міністэрства адукацыі Галіна Макаранкава.**

**У Беларусі ў адрозненне ад многіх краін СНД захавана ўнікальная, шматфункцыянальная сетка дашкольных устаноў: дзіцячыя садкі, дашкольныя цэнтры развіцця для дзяцей, якія маюць патрэбу ў аздараўленні, карэкцыйнай дапамозе, для дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця. Таксама працуюць новыя формы інтэграваных дашкольных устаноў, такія, як дзіцячы садок-школа, групы кароткачасовага знаходжання, рознаўзроставыя групы, сезонныя і гульнявыя пляцоўкі.**

## Перыяд афармлення

Першым крокам павінна быць знаёмства з дзіцячым садком і загадчыкам. Тут можна пацікавіцца, якія заняткі і аздараўляльныя мерапрыемствы праводзяцца з дзецьмі, удакладніць праграму і рэжым работы ўстановы. Варта таксама звярнуць увагу на тэрыторыю дзіцячага садка. Калі ўсё задавальняе, то неабходна напісаць заяву ва ўпраўленне адукацыі і, як правіла, пры наяўнасці свабодных месцаў ваша дзіця ў верасні пападзе ў выбраны садок.

Дарэчы, калі выбар паў на ўстанову, якая знаходзіцца ў адным раёне горада, а вы прапісаны ў іншым, не мае значэння. Галоўнае, каб у ёй былі свабодныя месцы. Іншае пытанне, што сёння не заўсёды, асабліва ў новых мікрараёнах, можна ўладкаваць дзіця ў садок побач з домам. Менавіта ў такіх выпадках неабходна загадзя звярнуцца ў аддзел адукацыі, г. зн. заявіць аб сваім жаданні трапіць у той ці іншы садок, напрыклад, праз год або два. Спецыяльны інфармацыйны банк даных, куды будзе ўнесена прозвішча вашага дзіцяці, дапамагае спецыялістам правільна разлічыць магчымасці дзіцячых садкоў і ўлічыць жаданні бацькоў.

Для пастаноўкі дзіцяці на ўлік неабходна мець пашпарт аднаго з бацькоў і пасведчанне аб нараджэнні дзіцяці. На падставе гэтых дакументаў і выдаецца накіраванне для ўладкавання малога ў дзіцячы садок. Для накіравання ў спецыяльную дашкольную ўстанову або санаторны дзіцячы садок спатрэбіцца яшчэ і заключэнне Цэнтра карэкцыйна-развівальнага навучання і рэабілітацыі або заключэнне тэрытарыяльнай урачэбна-кансультацыйнай камісіі.

У Беларусі адукацыя ў дзяржаўных дашкольных установах бясплатная. З бацькоў вылічваецца толькі штомесячная аплата за харчаванне, прычым у памеры 60 працэнтаў ад затрат. Астатнія расходы бярэ на сябе дзяржава. У лютым 2008 года была апублікавана пастанова Савета Міністраў, якая ўпарадкавала прадастаўленне льгот усім катэгорыям грамадзян на аплату харчавання ў дашкольных установах. У цяперашні час бацькоўскі ўзнос на харчаванне складае ад 26 да 55 тыс. рублёў. Усё залежыць ад узросту дзяцей, профілю і рэжыму работы ўстановы. Пры гэтым падлічана, што цалкам на знаходжанне дзіцяці ў дзіцячым садку, згодна з дзяржаўнымі сацыяльнымі стандартамі, затрачваецца звыш 3 млн рублёў у месяц.

Не спаганяецца плата з бацькоў (законных прадстаўнікоў), якія маюць дзяцей-інвалідаў, дзяцей, якія пакутуюць ад анкалагічных захворванняў, з членаў сем'яў вайскоўцаў, МУС, МНС, Камітэта дзяржаўнага кантролю, якія загінулі пры выкананні воінскага або службовага абавязку ў Афганістане або ў іншых дзяржавах, дзе вяліся баявыя дзеянні, і некаторых іншых катэгорый.

Але перш за ўсё бацькі павінны вызначыцца, ці сапраўды ёсць неабходнасць аддаваць дзіця ў садок менавіта ў гэтым годзе. І калі рашэнне прынятае, то акрамя збору неабходных дакументаў, мама і тата не павінны забыцца на галоўнае — псіхалагічна падрыхтаваць дзіця да наведвання садка.

## Перыяд адаптацыі

Спецыялісты называюць перыяд прывыкання да садка адаптацыйным. Ён бывае лёгкім і хуткім, а бывае цяжкім. Гэта залежыць ад многіх фактараў. Калі ў дзіцяці выяўленасць стрэсу мінімальная, то ў хуткім часе можна забыць аб негатыўных зрухах адаптацыйнага перыяду. Галоўнае — памятаць пра крызіс трох гадоў. Менавіта ў гэты перыяд малое пачынае адчуваць сябе асобай і хоча, каб гэта бачылі і іншыя. Псіхіка яго ў крайняй ступені напружана, становіцца больш ранімай. І перш чым прымаць рашэнне аб выхадзе на працу, трэба паглядзець уважліва на сваё дзіця: калі крызіс трох гадоў у поўным разгары, то лепш перачакаць, тым больш што цягнецца гэты перыяд не так доўга. Калі вашага малога як быццам падмянілі: па любой прычыне назіраюцца істэрыкі і капрызы, дзіця страціла ўсе навыкі самаабслугоўвання (у яго зноў намакаюць штонікі, яно «забылася», як карыстацца лыжкай, перастала гаварыць), то вынова адна: ім авалодаў страх — звычайны спадарожнік адаптацыйнага перыяду. Малое панічна баіцца, што вы яго забудзеце, не прыйдзеце па яго. Адрыў ад маці — вось ад чаго ваша дзіця ўпала ў такі стан. Бо мама — самае галоўнае, што ёсць у яго, а яна ўзяла і выйшла на працу. Менавіта так расцэньвае гэту сітуацыю трохгадовае дзіця.

Пры лёгкай ступені адаптацыі дзіця хутка (да аднаго месяца) выпрацоўвае новы стыль паводзінаў. Калі гэты першы ўрок «выжывання» пройдзены паспяхова, у далейшым ваш малы будзе хутка адаптавацца ў любой новай абстаноўцы на працягу ўсяго жыцця. І гэта адзін з асноўных аргументаў прыхільнікаў дзіцячага садка. Стрэс першых тыдняў правакуе хуткае развіццё ўсіх адаптацыйных механізмаў дзіцяці, што з'яўляецца для яго выдатнай школай жыцця і «задзелам» на доўгія гады. Як толькі малы наладзіць кантакт з аднагодкамі ў групе, адаптацыйны перыяд, можна лічыць, мінуў.

## Хатняя падрыхтоўка

Неабходна як мага раней прывучыць дзіця да думкі аб дзіцячым садку. Пры гэтым катэгарычна нельга абмяркоўваць пры малым пытанні і праблемы, звязаныя з гэтай установай. Нельга паказваць яму, што вы хвалюецеся. Ні ў якім разе нельга пагражаць вашаму маламу садком!

Загадзя неабходна даведацца аб рэжыме дня ў дзіцячым садку і ўвесці яго, пакуль дзіця знаходзіцца дома. Распарадак дня неабходна перастроіць так, каб малое лёгка прачыналася за гадзіну-паўтары да выхаду з дому ў садок. Калі дзіця ўжо не спіць днём, можна прывучыць яго проста ляжаць у ложку аднаму. Як мага раней малы павінен пазнаёміцца з дзецьмі ў дзіцячым садку і выхавальнікамі ў групе, куды ён павінен прыйсці. Вельмі добра, калі там акажуцца дзеці, з якімі ваша дзіця ўжо гуляла раней, напрыклад, у двары. Настройвайце яго як мага больш станоўча да яго паступлення ў дзіцячы садок. Узаемаадносіны дзяцей з равеснікамі ў гэтым узросце толькі фарміруюцца. Аддаючы дзіця ў дзіцячы садок, мы паскараем гэты працэс, таму няправільна пускаць яго на самацёк. Ці падыходзіць яно да групы дзяцей, якія гуляюць? Калі яму цяжка гэта зрабіць, трэба дапамагчы: навучыць яго правільна вітацца, прапаноўваць дзецям свае цацкі, прасіць дазволу гуляць з імі, правільна рэагаваць на адмову, знаходзіць кампрамісны варыянт.

Калі дзіця цяжка накарміць, то трэба максімальна прыблізіць яго меню дома да садаўскага. Інакш там яно адмовіцца есці. Навучыце малога прасіцца ў туалет, прычым абавязкова растлумачце яму, што можна і трэба гаварыць выхавальніцы або нянечцы аб сваім жаданні. Рыхтуйце да часовай разлукі з вамі і давайце яму зразумець, што гэта непазбежна, таму што ён ужо вялікі. Гаварыце аб тым, як гэта добра, што ён ужо такі дарослы. І самае галоўнае — увесь час тлумачце малому, што ён для вас, як і раней, дарагі і любімы.

Пастарайцеся спланаваць свой час так, каб у першы тыдзень наведвання дзіцячага садка дзіця не заставалася там больш чым дзве-тры гадзіны. Пастарайцеся ў выхадныя дні захоўваць дома такі ж рэжым, як у дзіцячым садку.

## Падрыхтоўка медыцынская

Перад афармленнем у дзіцячы садок неабходна наведаць паліклініку і педыятра. Ён дасць спецыяльную медыцынскую карту, з якой вы з дзіцем павінны прайсці вузкіх спецыялістаў, здаць аналізы і г.д. Таксама трэба праверыць наяўнасць неабходных прышчэпак — без гэтага малога ў дашкольную ўстанову не возьмуць. У далейшым кантроль за тэрмінамі правядзення прышчэпак ажыццяўляецца медсястрой дзіцячага садка.

Урачы часта раяць адпраўляць дзіця ў садок бліжэй к пяці гадам, калі арганізм стане больш моцным. Стрэс ад траплення ў дзіцячы калектыў часта «прыцягвае» інфекцыі. І, праўда, рос сабе малы, рос, не хварэў амаль, а тут пайшоў у садок і расхварэўся... Але калі ж тады фарміравацца імунітэту? І не трэба забываць, што дзіцяці, акрамя іншага, патрэбны і кантакт з аднагодкамі. Увогуле канчатковае рашэнне прымаюць бацькі. У Беларусі, напрыклад, згодна з існуючымі нарматыўнымі актамі, аддаваць малога ў дашкольную ўстанову можна з 2 месяцаў — у групу ранняга ўзросту. Вось толькі запатрабаванасці цяпер у такіх групах няма.

## Бацькам на заметку

У сістэме дашкольнай адукацыі працуюць таленавітыя людзі. Але, на жаль, статус выхавальніка не лічыцца такім прэстыжным, як, напрыклад, настаўніка. І ўзровень зарплаты ў садках ніжэйшы, чым у школе, і водпуск карацейшы. А вось сказаць, што нагрузкі або адказнасці менш, нельга, — малым нагляд патрэбен. У дзіцячых дашкольных установах рэспублікі сёння налічваецца больш за 950 вакансій выхавальнікаў.

У Мінадукацыі распрацаваны праект праграмы развіцця сістэмы дашкольнай адукацыі да 2014 года. У дакуменце прапаноўваецца шэраг мераў, якія накіраваны на павышэнне прэстыжу працоўнай дзейнасці педагагічных работнікаў дашкольных устаноў. Мяркуецца, што іх зарплата будзе павялічана, норма адпрацоўкі зніжана. Цяпер праект дакумента знаходзіцца на разглядзе Ўрада, пытанне плануецца вырашыць да сярэдзіны жніўня.

**Юлія ВАНІНА, БЕЛТА.**

Рады пазнаёміцца!

# ФЛОРБОЛ: НОВЫ ВІД СПОРТУ, НОВЫЯ МАГЧЫМАСЦІ

**Не так даўно ў фізкультурна-аздараўленчым комплексе «Атлант» адбылася прэзентацыя і першая ў нашай краіне афіцыйная сустрэча па флорболе паміж зборнымі Беларусі і Адкрытай лігі (Санкт-Пецярбург). Што гэта за экзатычны для нас пакуль від спорту, нам раскажа Мікалай Карповіч, заснавальнік флорбола ў Беларусі.**



— Флорбол — гэта разнавіднасць хакея з мячом у закрытым памяшканні. У Беларусі гэты від спорту з'явіўся восенню 2005 года. Усё пачалося з таго, што я, тады яшчэ студэнт універсітэта фізкультуры, пабываў на стажыроўцы ў Швецыі з мэтай пераймання вопыту мясцовага фізкультурнага каледжа. Менавіта там на адным з заняткаў упершыню і ўбачыў новую гульню. Хачу сказаць, што гэта разнавіднасць хакея мне вельмі спадабалася, таму праз некаторы час пасля вяртання на радзіму я звярнуўся да прарэктара ўніверсітэта з просьбай даць мне ў карыстанне падораныя шведскімі калегамі клюшкі і мячыкі для флорбола. Кіраўніцтва пайшло мне насустрач і нават выдзеліла для трэніровак будучай каманды спартзалу. З таго часу арганізаваная мной каманда вось ужо тры гады запар сустракаецца па суботах і трэніруецца.

***— Калі трэніроўкі выйшлі за межы вашай спартзалы?***

— Вельмі хутка, літаральна ў наступным, 2006 годзе, у спартакіяду народаў Расіі і Беларусі для навучэнцаў дзіцячых дамоў уключылі флорбол, і Міністэрства спорту з-за адсутнасці спецыялістаў вырашыла звярнуцца па дапамогу ва ўніверсітэт фізкультуры, так і выйшлі на мяне. Я наладзіў майстар-клас для дзяцей і хутка паехаў разам з імі ў Смаленск, дзе наша дзіцячая каманда заняла другое месца.

Далей — больш. У красавіку гэтага года мы вырашылі зрабіць рашучы крок — узяць удзел у міжнародным турніры «Кубак Гагарына», што праходзіў у Санкт-Пецярбургу. На жаль, у паўночнай сталіцы Расіі мы пацярпелі шэраг паражэнняў, але не абышлося і без перамог: з лікам 8:7 беларуская зборная перамагла фінскі клуб SamPo.

Хутка наша зборная пачала падрыхтоўку да вельмі важнага кроку — знаёмства беларускіх аматараў спорту з флорболам. Як вы ўжо ведаеце, 4 ліпеня гэта мерапрыемства адбылося. У складзе нашай каманды выступілі вядомыя беларускія хакеісты — Міхаіл Грабоўскі і Віталь Коваль, за што мы ім вельмі ўдзячныя.

З дапамогай гэтай гульні на нас звярнулі ўвагу, удзел хакейных «зорак» у невядомым дагэтуль відзе спорту зацікавіў многія СМІ, асобныя моманты сустрэчы былі паказаны па тэлебачанні.

***— Якім чынам плануецца далейшае развіццё флорбола ў нашай краіне?***

— Развіццё ні ў якім разе не павінна спыняцца і, спадзяюся, не спыніцца. Намі вельмі зацікавілася міжнародная федэрацыя, бо яна зараз налічвае 45 асацыяцый, а ў выпадку, калі такіх асацыяцый набярэцца 50, то дадзены від атрымае права разглядацца як алімпійскі. Міжнародная федэрацыя зацікаўленая ў тым, каб краін было як мага больш, таму не выключана, што ўжо ў снежні на кангрэсе, які мае адбыцца ў Празе, флорболу будзе нададзены статус алімпійскага віду. Але далёка наперад загадваць не буду, цяпер мы працуем над вырашэннем рэальных праблем, якія звязаны і з фінансаваннем, і з недахопам зацікаўленых людзей, як спартсменаў, так і арганізатараў, гатовых працаваць пакуль што толькі за ідэю. Дарэчы, дзверы нашай спартзалы адчыненыя для ўсіх ахвотнікаў.

***— Мікалай, як заснавальнік флорбола ў Беларусі і капітан нашай зборнай, калі ласка, прапануйце свой «рэцэпт» укаранення флорбола ў нашай краіне.***

— Перш за ўсё, народ павінен даведацца аб існаванні такога віду спорту. Пасля можна будзе весці гаворку аб адкрыцці спартыўных секцый для беларускіх хлопчыкаў і дзяўчатак. Вельмі б хацелася стварыць юнацкую і жаночую флорбольныя каманды.

Сёння я магу казаць аб мэтазгоднасці ўвядзення гэтага віду спорту ў школьныя праграмы, бо ён спрыяе фізічнаму развіццю дзяцей і тым больш не патрабуе вялікіх грашовых затрат.

**Вольга ДАМАРАЦКАЯ.**

## Дзень — без аўтамабіля!

Па ініцыятыве Міністэрства транспарту і камунікацый нашай краіны 22 верасня ў Беларусі ўпершыню пройдзе маштабная акцыя «Дзень без аўтамабіля». Як лічаць спецыялісты гэтага ведамства, акцыя паспрыяе зніжэнню ўзроўню шкоднага ўздзеяння транспарту на прыроду, паляпшэнню ўмоў пражывання насельніцтва гарадоў, дарожнаму руху і проста — здароваму ладу жыцця.

Акцыя «Дзень без аўтамабіля» традыцыйна не першы год праходзіць у многіх краінах свету менавіта 22 верасня, а ўпершыню яна адбылася ў 1997 годзе ў французскім горадзе Ла Рашэль. Праз год мерапрыемства ахапіла ўсю Францыю, а затым — і ўсю Еўропу. Летась у акцыі ўдзельнічалі 1353 гарады з 37 еўрапейскіх краін. Самае простае, што можа даказаць мерапрыемства, — гэта тое, што паветра можа быць чыстым, а дабрацца да работы на тралейбусе можна хутчэй, чым на асабістым аўтамабілі.

**Ул. інф.**

Выпрабавана на сабе

# «ДОБРЫ ДЗЕНЬ! ШТО ВАМ ПРАПАНАВАЦЬ?»

У прыродзе існуе такі тып людзей, якія заўсёды шукаюць прыгоды на сваю галаву. Самае галоўнае для іх — гэта рух, вывучэнне чагосьці новага. Так і наш карэспандэнт ужо каторы раз змяняе сваю прафесію. Ён ужо асвойваў асновы прафесіі кур'ера, фрылансера, ахоўніка, сёння ж — афіцыянта.

## Пошук працы

Гэта прафесія заўсёды запатрабаваная. У газетах, у Інтэрнэце вельмі шмат прапаноў. Праўда, большасць аб'яў — гэта прапановы агенцтваў. За свае паслугі яны бяруць пэўную суму і на працягу некаторага часу прапаноўваюць работу, якая вам падыходзіць. Толькі тут ёсць адно «але». Справа ў тым, што ў сваіх аб'явах агенцтвы абяцаюць высокую зарплату, на што многія і вядуцца. Праўда, зарплату ад 800 да 1000 долараў знайсці вельмі праблематычна. А ў адной з аб'яў менавіта такая сума і была напісаная. Але мне было б немагчыма ўладкавацца на гэтую работу, таму што там патрабаваліся дзяўчаты. Прапанова была, на мой погляд, трохі дзіўная: «тэрмінова патрабуюцца дзяўчаты ў лепшыя начныя клубы...». І чым гэта яны будуць там займацца?

Не ведаю з якой спробы, але я знайшоў сабе працу. «Рэстаран у цэнтры горада запрашае на часовую працу афіцыянтаў. Патрабаванні: сумленнасць, прыстойнасць, вопыт работы». Вопыту ў мяне, вядома, не было. Затое па прыродзе я вельмі сумленны і прыстойны. Мяне ўзялі, праўда, сказалі, што зарплата ў іх залежыць у тым ліку і ад працоўнага вопыту. Яна будзе каля 150 долараў.

## Практыка

Свой першы працоўны дзень я пачаў з практыкі. Мяне замацавалі за дзяўчынай Аленай, якая ўжо амаль год падзарабляе афіцыянтам у вольны ад вучобы час. Грошы ёй плацяць нядрэнныя, да таго яшчэ і чаявыя. Так Лене цалкам хапае на жыццё, нават у бацькоў не бярэ грошы. Але пры гэтым дзяўчына не збіраецца заставацца працаваць афіцыянтам усё жыццё, пасля заканчэння ўніверсітэта яна паедзе ў свой родны правінцыйны горад.

Задача Лены заключалася ў тым, каб навучыць мяне асновам прафесіі. За адзін дзень гэта, вядома, складана зрабіць. Самае галоўнае — гэта ветлівасць, прыязныя адносіны да кожнага наведвальніка, якаснае абслугоўванне. «Нават не думай нікому грубіць, інакш застанешся без работы. Самой першы час было складана стрымліваць сябе, але ўжо навучылася. Разумееш, вельмі часта прыходзяць такія кліенты, якія ўсім незадаволеныя. Але не варта звяртаць на іх увагу, беражы лепш свае нервы», — дзялілася са мной вопытам Алена. У працэсе майго навучання вялікая ўвага надавалася абслугоўванню кліентаў. Важна сачыць за тым, каб усе своечасова атрымалі свае заказы. Нельга дапусціць, каб хтосьці сядзеў і доўга чакаў сваёй чаргі. Менавіта таму афіцыянт павінен быць вельмі ўважлівым. Як мне здалося ў гэты дзень, нічога асабліва складанага няма ў гэтай прафесіі. Да таго ж заўтра мяне чакаў поўны працоўны дзень. Я сам павінен з усім спраўляцца. Не, вядома, па дапамогу я мог звяртацца заўсёды, але мне гэтага не хацелася рабіць. Хацелася да ўсяго прыйсці самому, без дапамогі.

## Першы працоўны дзень

Мой першы працоўны дзень, вядома, пачаўся вельмі цікава. Справа ў тым, што ўлетку многія рэстараны ставяць на вуліцы «палаткі» для павелічэння пасадачных месцаў. Так было і ў нашым рэстаране. Раніцай прыйшлі маладыя людзі, зрабілі заказ на вялікую суму і пайшлі на вуліцу на свежае паветра. А я так загаварыўся з калегамі, што не заўважыў, як гэтыя хлопцы зніклі. Але гэта не самае страшнае. Яны ж не заплацілі. А хто будзе плаціць за іх? Думаю, вы здагадаліся.... Той, хто іх абслугоўваў. Значыць, я. Мяне моцна ўразіў гэты выпадак. Я ніколі і не мог сабе нават уявіць, што людзі так могуць зрабіць. Я ведаў, што ёсць шмат непрыстойных, але не да такой жа ступені... Алена супакоіла мяне, сказала, што за цэлы дзень я яшчэ вярну сабе гэтыя грошы. Многія кліенты пакідаюць чаявыя. Так яно і атрымалася, за цэлы дзень я пагасіў гэтую суму. Праўда, якім коштам. На вуліцы было цёпла, нават горача. Таму людзей прыйшло столькі, што вольныя столікі кліентам давялося доўга чакаць. Бліжэй да вечара я адчуў стомленасць, слабасць. Вельмі моцна балелі ногі. Думалася, што час пік ужо прайшоў, але не тут тое было! Увечары, наадварот, людзей стала намнога больш. Было столькі работы, што я ні на секунду не прысеў. Мой першы працоўны дзень скончыўся бліжэй да поўначы. Дахаты я даехаў на таксі.

## Працяг працы

На наступны дзень у мяне балелі ўсе косці. Учора столькі часу быў на нагах, практычна наогул не сядзеў. А напярэдадні быў яшчэ адзін дзень працы. Як ні дзіўна, усё прайшло досыць спакойна. Можа, таму, што быў панядзелак. У аўторак у мяне павінен быць выхадны. Але мне паведамілі, што трэба будзе выйсці папрацаваць. Што рабіць?

Як далей складвалася мая кар'ера афіцыянта? Не магу сказаць, што вельмі ўдала. За гэты час я зразумеў, што афіцыянтам можа стаць далёка не кожны. Чаму? Справа ў тым, што не кожны зможа быць «хлопчыкам на пабягушках». Трэба ўмець не проста мець зносіны з людзьмі, а яшчэ і ўціхамірыць сваю ганарыстасць. Бо часам табе адкрыта грубіяняць, а ты нічога не можаш адказаць. А ўсё па той прычыне, што «кліент заўсёды мае рацыю»! У мяне не атрымалася прымусіць сябе маўчаць, калі мне грубіянілі. Ды і каму гэта спадабаецца? І мне самому захацелася сысці. Больш я не вярнуўся на гэтую працу. Прызнацца, насамрэч непрыемна быць «хлопцам на пабягушках». Нават крыху крыўдна.

## Плюсы і мінусы працы

Чаго больш у гэтай прафесіі: плюсоў або мінусаў? Складана адназначна адказаць. Да плюсоў можна аднесці досыць высокі заробак. Праўда, не сам заробак, а чаявыя. Звычайна для афіцыянтаў гэта і з'яўляецца асноўнай крыніцай прыбытку. Таму што зарплата зусім невялікая. У тым рэстаране, дзе я працаваў, плацілі каля 150 долараў у сярэднім. Праўда, за дзень можна было долараў 50 атрымаць чаявымі. У нас у краіне далёка не многія наведвальнікі пакідаюць афіцыянтам чаявыя. На Захадзе, напрыклад, прынята даваць дзесятую частку ад кошту заказу. Калі, напрыклад, заказалі вячэру на 50 тысяч, то афіцыянту адлічваюць 5 тысяч. Звычайны этыкет, якога ў нас мала хто прытрымліваецца. Наадварот, многія кліенты чакаюць рэшту... рублёў трыста. Многія проста даюць без рэшты.

Так, заробак нядрэнны. Але якімі намаганнямі даюцца гэтыя грошы? Афіцыянтам даводзіцца працаваць па 12, а то і больш, гадзін у суткі. Калі маладыя людзі яшчэ неяк могуць быць на нагах столькі часу, то тым, хто больш сталы, гэта даецца складаней. Вядома, зносіны — гэта пазітыў, радасць. Але не ў гэтым выпадку. Так што плюсоў у гэтай працы вельмі мала. Цікава, што для большасці людзей праца афіцыянтам часовая. Хтосьці падзарабляе ў вольны ад вучобы час, а хтосьці — падчас пошуку новай работы.

**Сяргей ДЗЕВЯТОЎСКІ.**

# «Калі сустрэць няшчасце ўсмешкай, то яно, плачучы, уцячэ ад цябе...»

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

Менавіта туды я і накіравалася, каб пачуць асабістыя думкі і ўражанні Насці. Утульная студыя сустрэла мяне дзесяткамі фотаздымкаў, якія віселі на сценах, ветлівымі ўсмешкамі супрацоўнікаў і своеасаблівым духам творчасці, якім, здаецца, прасякнуты тут кожны прадмет. За сталом сядзела звычайная, на першы погляд, дзяўчынка. Аднак кола яе творчых здольнасцяў мяне проста ўразіла: усходнія адзінаборствы, філасофія, вакал. Таксама ў Насці ёсць багатая калекцыя статуэтак анёлаў з усяго свету. Насця не мае спецыяльнай музычнай адукацыі, таму хоча сур'ёзна заняцца гэтым і навучыцца граць на гітары. Але асноўны яе занятак — гэта харэаграфія, якой Насця займаецца ўжо 7 гадоў.

У студыі дзяўчынка адносна нядаўна, з восені. Напачатку былі розныя тэсты, трэнінгі, якія дапамагалі развіваць творчае вобразнае мысленне, навыкі пераўвасаблення. Далей — больш сур'ёзная і складаная праца: пачалі рыхтаваць партфоліо. Гэта вельмі важны і адказны момант, бо менавіта партфоліо дапамагае асобе максімальна раскрыць свой творчы патэнцыял, шматлікія грані свайго «Я»: ад дзяўчынкі-анёла да бессаромнай спакусніцы-прыгажуні. Быць рознай — пакорлівай на гэтай старонцы і свавольнай на наступнай — гэта магчыма. Сведкай гэтага я стала, калі праглядала Насціны фотаздымкі. Цяжка было паверыць, што воін у кімано, свецкая дама, канапатая лялька, — гэта адзін чалавек. На гэта і робіцца акцэнт падчас правядзення фотасесіі: пазбегнуць шаблоннасці і аднатыпнасці.

«Усмешкі Мора» — першы Насцін фестываль такога маштабу. Дагэтуль яна была госцем разнастайных конкурсаў беларускага фармату, выступала ў Індыйскім пасольстве. Аднак з ростам майстэрства расло і жаданне быць прызнанай і ацэненай не толькі ў сябе на Радзіме. Надышоў час і міжнароднаму журы выставіць свае балы! Вырашылі паспрабаваць — і не памыліліся. У сваёй намінацыі «Харэаграфія» ў раздзеле «Танцы народаў свету» Настасся Гамолка заняла ганаровае чацвёртае месца за індыйскі і ірландскі танцы. Гэта адна з самых вялікіх намінацый, якая ўключала каля тысячы ўдзельнікаў. А таксама была ў ліку трыццаці ўдзельнікаў гала-канцэрта, дзе і атрымала Кубак Абсалютнага Пераможцы. А гэта даволі высокі вынік, бо складана выдзеліцца сярод іншых такіх жа канкурсантаў з Венгрыі, Грэцыі, Фінляндыі, Румыніі і іншых краін. Аднак, па словах Насці, духу саперніцтва зусім не адчувалася. Наадварот, дзеці падтрымлівалі і падбадзёрвалі адзін аднаго, бо ўсе яны былі аб'яднаны адной мэтай: не паказаць сваю перавагу над астатнімі, а прадэманстраваць Яе Вялікасць Творчасць ва ўсёй паўнаце.

Насціна перамога — гэта таксама вынік плённай працы яе непасрэднага кіраўніка і проста добрага сябра рэгіянальнага дырэктара па адборы, падрыхтоўцы і прадстаўленні талентаў Рэспублікі Беларусь на міжнародных конкурсах і фестывалях, прафесара філасофіі, творчага кіраўніка Імідж-дызайн студыі «Вадалея» Кацярыны Пашкевіч. Менавіта ад яе я і даведалася пра спецыфіку працы студыі:

— Для нас галоўнае — гэта навучыць дзіця валодаць творчым мысленнем, тэхналогіяй стварэння вобразу. Мы не праводзім конкурсаў прыгажосці, наша задача не ў тым, каб зрабіць артыста, мы імкнёмся выпусціць гарманічна сфарміраваную асобу, з верай у свае сілы і неабмежаванымі творчымі здольнасцямі. На жаль, у нас амаль што не практыкуецца рэклама розных прадпрыемстваў, банкаў з дапамогай нашых маленькіх «спецыялістаў».

Прывозячы з конкурсаў розныя ўзнагароды, яны б не толькі самі былі пераможцамі, але і прыносілі б бонусы прадпрыемству, якое яны прэзентуюць. Я вельмі часта бываю ва Ўкраіне, у Расіі, краінах Прыбалтыкі. Там, наадварот, вельмі зацікаўленыя ў падобных студыях. Менавіта на іх, а не на мадэльныя агенцтвы робіцца акцэнт. Тым больш, што ў нас дастаткова высокі ўзровень падрыхтоўкі, нас вельмі часта запрашаюць у якасці ўдзельнікаў, бо ведаюць, што мы ніколі не будзем паўтарацца, а заўсёды прывязём нешта эксклюзіўнае, адметнае. Вось і цяпер Насцю запрасілі на фестываль пераможцаў саюза «Надзея Еўропы» розных гадоў, які пройдзе ў Іспаніі, на Пальма-дэ-Маёрцы. Так што, нам заўсёды ёсць над чым працаваць.



Усе міжнародныя конкурсы праходзяць у абсалютна іншай сістэме, чым у нас. Мы вельмі выпеставаныя, нам трэба ўсё расказаць і паказаць. Там усё інакш. На тое, каб агледзець сцэну, праверыць яе фармат, нам давалася прыкладна 30 секунд. Усё без музыкі, у рэжыме нон-стоп. Для нас гэта, безумоўна, складана. Але такія стрэсавыя сітуацыі — добрая закалка, праверка на псіхалагічную вытрыманасць.

Імкненне быць лепшай, гонар за сваю краіну, неверагодная сіла волі і штодзённая праца — вось што дапамагло Насці ў барацьбе. А яшчэ, як лічыць сама дзяўчына, трэба заўсёды заставацца самім сабой, верыць у сваю мару, ніколі не здавацца і не баяцца цяжкасцяў. І, нібы ў доказ сваёй думкі, прывяла словы з індыйскай філасофіі: «Калі сустрэць няшчасце ўсмешкай, то яно, плачучы, уцячэ ад цябе». А можа яно і сапраўды так?

**Ірына БАГАМОЛАВА.**

*Прыняты Палатай прадстаўнікоў 24 чэрвеня 2008 года*
*Адобраны Саветам Рэспублікі 28 чэрвеня 2008 года*

# Закон Рэспублікі Беларусь

# АБ РЭГІСТРЫ НАСЕЛЬНІЦТВА

## ГЛАВА 1
## АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

**Артыкул 1. Сфера дзеяння гэтага Закона**

Гэтым Законам рэгулююцца грамадскія адносіны, якія ўзнікаюць пры ажыццяўленні дзейнасці па ўнясенні персанальных даных фізічных асобаў у рэгістр насельніцтва, іх актуалізацыі, выключэнні, захоўванні, аднаўленні, прадастаўленні, выкарыстанні і ахове.

**Артыкул 2. Асноўныя тэрміны, што прымяняюцца ў гэтым Законе, і іх азначэнні**

Для мэтаў гэтага Закона прымяняюцца наступныя асноўныя тэрміны і іх азначэнні:

рэгістр насельніцтва (далей — рэгістр) — дзяржаўная цэнтралізаваная аўтаматызаваная інфармацыйная сістэма, аснову якой складае база персанальных даных грамадзян Рэспублікі Беларусь, а таксама іншаземных грамадзян і асобаў без грамадзянства, якія пастаянна пражываюць у Рэспубліцы Беларусь (далей — фізічныя асобы);

распарадчык рэгістра — дзяржаўны орган, які выконвае функцыі па вядзенні і кіраванні рэгістрам;

рэгіструючая служба — структурнае падраздзяленне распарадчыка рэгістра, якое ўпаўнаважана на вядзенне рэгістра;

персанальныя даныя фізічных асоб (далей — персанальныя даныя) — сукупнасць асноўных і дадатковых персанальных даных, а таксама даных аб рэквізітах дакументаў, якія пацвярджаюць асноўныя і дадатковыя персанальныя даныя канкрэтных фізічных асобаў;

запіс у рэгістры — персанальныя даныя і звязаныя з імі адзнакі, якія ўтрымліваюцца ў рэгістры;

ідэнтыфікацыйны нумар — літаралічбавая паслядоўнасць, якая з'яўляецца асноўнай ідэнтыфікуючай прыметай фізічнай асобы ў працэсе ўнясення яе персанальных даных у рэгістр, іх актуалізацыі, выключэння, захоўвання, аднаўлення, прадастаўлення, выкарыстання і ахова.

**Артыкул 3. Мэты і задачы рэгістра**

1. Мэтамі рэгістра з'яўляюцца:

1.1. ахова правоў і свабод фізічных асобаў;

1.2. фарміраванне адзінай інфармацыйнай прасторы ў Рэспубліцы Беларусь.

2. Задачамі рэгістра з'яўляюцца:

2.1. забеспячэнне ўліку фізічных асобаў;

2.2. аператыўнае забеспячэнне дакладнымі і актуальнымі персанальнымі данымі дзяржаўных органаў, іншых арганізацый (далей — арганізацыі), натарыусаў і фізічных асобаў;

2.3. забеспячэнне інфармацыйнага ўзаемадзеяння і супрацоўніцтва арганізацый, у тым ліку ў ходзе міждзяржаўнага і міжнароднага інфармацыйнага абмену.

**Артыкул 4. Прынцыпы функцыянавання рэгістра**

Функцыянаванне рэгістра грунтуецца на прынцыпах:

законнасці;

захоўвання правоў і свабод чалавека;

адзінкавасці рэгістрацыі;

прымянення адзінага ўнікальнага фармату запісаў пры ўнясенні персанальных даных у рэгістр і прадастаўленні персанальных даных з рэгістра;

бесперапыннасці вядзення рэгістра;

паўнаты, дакладнасці і актуальнасці персанальных даных, якія ўтрымліваюцца ў рэгістры;

забеспячэння аховы персанальных даных, якія ўтрымліваюцца ў рэгістры;

кантролю за вядзеннем рэгістра і выкарыстаннем персанальных даных, якія ўтрымліваюцца ў рэгістры.

**Артыкул 5. Прававая аснова функцыянавання рэгістра**

Прававую аснову функцыянавання рэгістра складаюць Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь, гэты Закон і іншыя акты заканадаўства Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 6. Фінансаванне і матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне мерапрыемстваў, звязаных з рэалізацыяй палажэнняў гэтага Закона**

Фінансаванне і матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне мерапрыемстваў, звязаных з рэалізацыяй палажэнняў гэтага Закона, ажыццяўляюцца за кошт сродкаў рэспубліканскага і мясцовых бюджэтаў, у тым ліку прадугледжаных на ўтрыманне распарадчыка рэгістра, іншых дзяржаўных органаў і іншых дзяржаўных арганізацый (далей — дзяржаўныя арганізацыі), якія забяспечваюць унясенне ў рэгістр персанальных даных, а таксама за кошт іншых крыніц, не забароненых заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

## ГЛАВА 2
## ЗАПІС У РЭГІСТРЫ. ПАРАДАК ВЯДЗЕННЯ РЭГІСТРА

**Артыкул 7. Запіс у рэгістры**

1. Запіс у рэгістры складаецца з наступных персанальных даных (пры іх наяўнасці) і звязаных з імі адзнак:

1.1. асноўныя персанальныя даныя;

1.2. дадатковыя персанальныя даныя;

1.3. даныя аб рэквізітах дакументаў, якія пацвярджаюць асноўныя і дадатковыя персанальныя даныя;

1.4. адзнакі аб унясенні персанальных даных у рэгістр, іх актуалізацыі, выключэнні, перадачы на захоўванне ў электронны архіў, аднаўленні, прадастаўленні арганізацыям, натарыусам і фізічным асобам.

2. Кожны запіс у рэгістры валодае статусам электроннага дакумента ў адпаведнасці з Законам Рэспублікі Беларусь ад 10 студзеня 2000 года «Аб электронным дакуменце» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2000 г., № 7, 2/132).

**Артыкул 8. Асноўныя персанальныя даныя**

1. Да асноўных персанальных даных адносяцца:

1.1. ідэнтыфікацыйны нумар;

1.2. прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку;

1.3. пол;

1.4. число, месяц, год (далей — дата) нараджэння;

1.5. месца нараджэння;

1.6. лічбавы фотапартрэт;

1.7. даныя аб грамадзянстве (падданстве);

1.8. даныя аб рэгістрацыі па месцы жыхарства і (або) месцы знаходжання;

1.9. даныя аб смерці або аб'яўленні фізічнай асобы памерлай, прызнанні без вестак адсутнай, недзеяздольнай, абмежавана дзеяздольнай.

2. Данымі аб грамадзянстве (падданстве) з'яўляюцца:

2.1. грамадзянства (падданства);

2.2. падставы набыцця або спынення грамадзянства Рэспублікі Беларусь;

2.3. дата набыцця або спынення грамадзянства Рэспублікі Беларусь.

3. Данымі аб рэгістрацыі па месцы жыхарства і (або) месцы знаходжання з'яўляюцца:

3.1. месца жыхарства і (або) месца знаходжання;

3.2. дата рэгістрацыі па месцы жыхарства і (або) месцы знаходжання;

3.3. дата зняцця з рэгістрацыйнага ўліку па месцы жыхарства і (або) месцы знаходжання.

4. Данымі аб смерці або аб'яўленні фізічнай асобы памерлай, прызнанні без вестак адсутнай, недзеяздольнай, абмежавана дзеяздольнай з'яўляюцца:

4.1. дата, месца і прычына смерці, месца пахавання;

4.2. дата аб'яўлення фізічнай асобы памерлай, прызнання без вестак адсутнай, дата адмены адпаведнага рашэння;

4.3. дата прызнання фізічнай асобы недзеяздольнай, абмежавана дзеяздольнай, дата адмены адпаведнага рашэння;

4.4. дата ўстанаўлення апекі, папячыцельства;

4.5. дата спынення апекі, папячыцельства;

4.6. дата адхілення апекуноў, папячыцеляў ад выканання іх абавязкаў.

**Артыкул 9. Ідэнтыфікацыйны нумар**

1. Ідэнтыфікацыйны нумар фарміруецца ў цэнтралізаваным парадку па спецыяльнай методыцы, якая вызначана Міністэрствам унутраных спраў Рэспублікі Беларусь.

2. Ідэнтыфікацыйны нумар застаецца нязменным на працягу ўсяго перыяду існавання запісу ў рэгістры, за выключэннем выпадкаў змянення даты нараджэння, полу фізічнай асобы, памылкова генерыраванага ідэнтыфікацыйнага нумару. Ідэнтыфікацыйны нумар указваецца ў дакументах, якія сведчаць фізічную асобу.

**Артыкул 10. Дадатковыя персанальныя даныя**

1. Да дадатковых персанальных даных адносяцца даныя:

1.1. аб бацьках, апекунах, папячыцелях, сямейным становішчы, мужу (жонцы), дзіцяці (дзецях) фізічнай асобы;

1.2. аб групе крыві;

1.3. аб прыжыццёвай нязгодзе на забор органаў і (або) тканак для трансплантацыі пры наступленні смерці;

1.4. аб вышэйшай адукацыі, вучонай ступені, вучоным званні;

1.5. аб родзе заняткаў;

1.6. аб пенсіі, штомесячным грашовым забеспячэнні па заканадаўстве аб дзяржаўнай службе (далей — штомесячнае грашовае забеспячэнне), штомесячнай страхавой выплаце па абавязковым страхаванні ад няшчасных выпадкаў на вытворчасці і прафесійных захворванняў;

1.7. аб падатковых абавязацельствах;

1.8. аб выкананні воінскага абавязку.

2. Данымі аб бацьках, апекунах, папячыцелях, сямейным становішчы, мужу (жонцы), дзіцяці (дзецях) фізічнай асобы з'яўляюцца:

2.1. прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку, грамадзянства (падданства), дата, месца нараджэння і ідэнтыфікацыйны нумар бацькі;

2.2. прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку, грамадзянства (падданства), дата, месца нараджэння і ідэнтыфікацыйны нумар маці;

2.3. прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку, грамадзянства (падданства), дата, месца нараджэння і ідэнтыфікацыйны нумар апекуна, папячыцеля;

2.4. дата і месца рэгістрацыі заключэння шлюбу, скасавання шлюбу, прызнання шлюбу несапраўдным;

2.5. прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку, грамадзянства (падданства), дата, месца нараджэння і ідэнтыфікацыйны нумар мужа (жонкі);

2.6. прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку, грамадзянства (падданства), дата, месца нараджэння і ідэнтыфікацыйны нумар дзіцяці (дзяцей);

2.7. дата пазбаўлення бацькоўскіх правоў, аднаўлення ў бацькоўскіх правах.

3. Данымі аб вышэйшай адукацыі і вучонай ступені, вучоным званні з'яўляюцца:

3.1. назва вышэйшай навучальнай установы;

3.2. дата залічэння ў вышэйшую навучальную ўстанову;

3.3. дата заканчэння вышэйшай навучальнай установы;

3.4. атрыманая спецыяльнасць;

3.5. вучоная ступень, вучонае званне;

3.6. дата прысуджэння вучонай ступені, прысваення вучонага звання.

4. Данымі аб родзе заняткаў з'яўляюцца:

4.1. статус працуючага, беспрацоўнага, непрацуючага;

4.2. месца працы;

4.3. дата працаўладкавання, пастаноўкі на ўлік у якасці беспрацоўнага;

4.4. дата звальнення, зняцця з уліку ў якасці беспрацоўнага;

4.5. звесткі аб тым, ці з'яўляецца фізічная асоба заснавальнікам (удзельнікам, уласнікам маёмасці) юрыдычнай асобы (за выключэннем адкрытых акцыянерных таварыстваў, таварыстваў уласнікаў, спажывецкіх кааператываў, садаводчых таварыстваў, гандлёва-прамысловых палат), індывідуальным прадпрымальнікам.

5. Данымі аб пенсіі, штомесячным грашовым забеспячэнні, штомесячнай страхавой выплаце па абавязковым страхаванні ад няшчасных выпадкаў на вытворчасці і прафесійных захворванняў з'яўляюцца:

5.1. від пенсіі;

5.2. дата прызначэння, спынення выплаты пенсіі, штомесячнага грашовага забеспячэння, штомесячнай страхавой выплаты па абавязковым страхаванні ад няшчасных выпадкаў на вытворчасці і прафесійных захворванняў.

6. Данымі аб падатковых абавязацельствах з'яўляюцца:

6.1. дата пастаноўкі на ўлік у падатковым органе;

6.2. уліковы нумар плацельшчыка;

6.3. наяўнасць запазычанасці па падатковых абавязацельствах.

7. Данымі аб выкананні воінскага абавязку з'яўляюцца:

7.1. дата прыёму на воінскі ўлік;

7.2. дата зняцця (выключэння) з воінскага ўліку.

**Артыкул 11. Даныя аб рэквізітах дакументаў, якія пацвярджаюць асноўныя і дадатковыя персанальныя даныя**

Разам з асноўнымі персанальнымі данымі і дадатковымі персанальнымі данымі ў запісе ў рэгістры змяшчаюцца даныя аб рэквізітах дакументаў, якія пацвярджаюць указаныя персанальныя даныя:

назва дакумента;

серыя;

нумар;

дата выдачы (прыняцця);

тэрмін дзеяння;

назва арганізацыі, якая выдала (прыняла) дакумент.

**Артыкул 12. Дзяржаўныя арганізацыі, якія ўносяць персанальныя даныя ў рэгістр**

1. Фарміраванне рэгістра і наступная актуалізацыя персанальных даных, якія ўтрымліваюцца ў ім, ажыццяўляюцца дзяржаўнымі арганізацыямі ў парадку, устаноўленым гэтым артыкулам і артыкуламі 13 і 14 гэтага Закона.

2. У рэгістр уносяцца персанальныя даныя:

2.1. Міністэрствам унутраных спраў Рэспублікі Беларусь:

ідэнтыфікацыйны нумар;

прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку;

пол;

дата нараджэння;

месца нараджэння;

лічбавы фотапартрэт;

аб грамадзянстве (падданстве);

аб рэгістрацыі па месцы жыхарства і (або) месцы знаходжання;

аб пенсіях фізічных асобаў, пенсійнае забеспячэнне якіх ажыццяўляецца гэтым міністэрствам у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь;

2.2. Фондам сацыяльнай абароны насельніцтва Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь:

месца працы;

дата працаўладкавання;

дата звальнення;

2.3. Міністэрствам юстыцыі Рэспублікі Беларусь — аб тым, ці з'яўляецца фізічная асоба заснавальнікам (удзельнікам, уласнікам маёмасці) юрыдычнай асобы (за выключэннем адкрытых акцыянерных таварыстваў, таварыстваў уласнікаў, спажывецкіх кааператываў, садаводчых таварыстваў, гандлёва-прамысловых палат), індывідуальным прадпрымальнікам;

2.4. Вышэйшай атэстацыйнай камісіяй Рэспублікі Беларусь:

вучоная ступень, вучонае званне;

дата прысуджэння вучонай ступені, прысваення вучонага звання;

2.5. Міністэрствам абароны Рэспублікі Беларусь — аб пенсіях фізічных асобаў, пенсійнае забеспячэнне якіх ажыццяўляецца гэтым міністэрствам у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь;

2.6. ваеннымі камісарыятамі — аб выкананні воінскага абавязку;

2.7. Міністэрствам па падатках і зборах Рэспублікі Беларусь — аб падатковых абавязацельствах;

2.8. Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь:

назва вышэйшай навучальнай установы;

дата залічэння ў вышэйшую навучальную ўстанову;

дата заканчэння вышэйшай навучальнай установы;

атрыманая спецыяльнасць;

2.9. Міністэрствам аховы здароўя Рэспублікі Беларусь:

аб групе крыві;

аб прыжыццёвай нязгодзе на забор органаў і (або) тканак для трансплантацыі пры наступленні смерці;

2.10. Міністэрствам па надзвычайных сітуацыях Рэспублікі Беларусь — аб пенсіях фізічных асобаў, пенсійнае забеспячэнне якіх ажыццяўляецца гэтым міністэрствам у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь;

2.11. Камітэтам дзяржаўнай бяспекі Рэспублікі Беларусь — аб пенсіях фізічных асобаў, пенсійнае забеспячэнне якіх ажыццяўляецца гэтым камітэтам у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь;

2.12. Генеральнай пракуратурай Рэспублікі Беларусь — аб пенсіях фізічных асобаў, пенсійнае забеспячэнне якіх ажыццяўляецца Генеральнай пракуратурай Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь;

2.13. Беларускім рэспубліканскім унітарным страхавым прадпрыемствам «Белдзяржстрах» — аб штомесячных страхавых выплатах па абавязковым страхаванні ад няшчасных выпадкаў на вытворчасці і прафесійных захворванняў, забеспячэнне якіх ажыццяўляецца гэтым прадпрыемствам у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь;

2.14. мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі:

аб статусе працуючага, беспрацоўнага, непрацуючага;

дата пастаноўкі на ўлік у якасці беспрацоўнага;

дата зняцця з уліку ў якасці беспрацоўнага;

аб пенсіях, не ўказаных у абзацы дзесятым падпункта 2.1, падпунктах 2.5, 2.10—2.12 гэтага пункта, а таксама аб штомесячным грашовым забеспячэнні;

дата ўстанаўлення апекі, папячыцельства;

прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку, грамадзянства (падданства), дата, месца нараджэння і ідэнтыфікацыйны нумар апекуна, папячыцеля;

дата спынення апекі, папячыцельства;

дата адхілення апекуноў, папячыцеляў ад выканання іх абавязкаў;

месца пахавання;

2.15. агульнымі судамі:

дата аб'яўлення фізічнай асобы памерлай, прызнання без вестак адсутнай, дата адмены адпаведнага рашэння;

дата прызнання фізічнай асобы недзеяздольнай, абмежавана дзеяздольнай, дата адмены адпаведнага рашэння;

дата пазбаўлення бацькоўскіх правоў, аднаўлення ў бацькоўскіх правах;

дата і месца рэгістрацыі скасавання шлюбу, прызнання шлюбу несапраўдным;

2.16. органамі, якія рэгіструюць акты грамадзянскага стану:

ідэнтыфікацыйны нумар;

прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку;

пол;

дата нараджэння;

месца нараджэння;

прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку, грамадзянства (падданства), дата, месца нараджэння і ідэнтыфікацыйны нумар бацькі;

прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку, грамадзянства (падданства), дата, месца нараджэння і ідэнтыфікацыйны нумар маці;

прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку, грамадзянства (падданства), дата, месца нараджэння і ідэнтыфікацыйны нумар мужа (жонкі);

прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку, грамадзянства (падданства), дата, месца нараджэння і ідэнтыфікацыйны нумар дзіцяці (дзяцей);

дата і месца рэгістрацыі заключэння шлюбу, скасавання шлюбу (да 1 верасня 1999 года);

дата, месца і прычына смерці.

3. Персанальныя даныя, указаныя ў абзацах другім—шостым падпункта 2.1 пункта 2 гэтага артыкула, уносяцца ў рэгістр Міністэрствам унутраных спраў Рэспублікі Беларусь;

у дачыненні да грамадзян Рэспублікі Беларусь — пры выдачы пашпарта грамадзяніна Рэспублікі Беларусь;

у дачыненні да іншаземных грамадзян і асобаў без грамадзянства, якія пастаянна пражываюць у Рэспубліцы Беларусь, і іх няпоўнагадовых дзяцей — пры выдачы пасведчання на права жыхарства ў Рэспубліцы Беларусь;

у дачыненні да няпоўнагадовых дзяцей, якія набываюць грамадзянства Рэспублікі Беларусь у парадку рэгістрацыі ў адпаведнасці з Законам Рэспублікі Беларусь ад 1 жніўня 2002 года «Аб грамадзянстве Рэспублікі Беларусь» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2002 г., № 88, 2/885) або па падставах, якія прадугледжаны міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь, — пры набыцці грамадзянства Рэспублікі Беларусь.

Персанальныя даныя, указаныя ў абзацах другім—шостым падпункта 2.16 пункта 2 гэтага артыкула, уносяцца ў рэгістр органамі, якія рэгіструюць акты грамадзянскага стану:

у дачыненні да грамадзян Рэспублікі Беларусь, іншаземных грамадзян і асобаў без грамадзянства, якія пастаянна пражываюць у Рэспубліцы Беларусь, — пры рэгістрацыі нараджэння;

у дачыненні да няпоўнагадовых дзяцей, якія нарадзіліся і не атрымалі пашпартоў грамадзян Рэспублікі Беларусь да ўступлення ў сілу гэтага Закона.

**Артыкул 13. Унясенне персанальных даных у рэгістр**

1. Унясенне персанальных даных у рэгістр ажыццяўляецца бесперапынна ў рэжыме рэальнага часу праз сістэму каналаў сувязі ў храналагічным парадку дзяржаўнымі арганізацыямі, якія ўносяць персанальныя даныя ў рэгістр у адпаведнасці з артыкулам 12 гэтага Закона.

2. Персанальныя даныя, якія ўносяцца ў рэгістр, сведчацца электронным лічбавым подпісам упаўнаважанага работніка дзяржаўнай арганізацыі, якая іх уносіць. Пры гэтым адказнасць у адпаведнасці з заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь за паўнату, дакладнасць і актуальнасць персанальных даных, якія ўносяцца ў рэгістр, нясе кіраўнік дзяржаўнай арганізацыі, якая ўносіць гэтыя даныя.

3. Пры ўнясенні персанальных даных у рэгістр кожнага запісу ў рэгістры аўтаматычна прысвойваецца парадкавы нумар, а таксама робяцца наступныя адзнакі:

3.1. дата і час унясення персанальных даных;

3.2. назва дзяржаўнай арганізацыі, якая ўнесла персанальныя даныя ў рэгістр.

**Артыкул 14. Актуалізацыя персанальных даных**

1. Актуалізацыя персанальных даных — замена персанальных даных, якія ўтрымліваюцца ў рэгістры, актуальнымі персанальнымі данымі.

2. Актуалізацыя персанальных даных ажыццяўляецца бесперапынна ў рэжыме рэальнага часу праз сістэму каналаў сувязі дзяржаўнымі арганізацыямі, якія ўносяць персанальныя даныя ў рэгістр у адпаведнасці з артыкулам 12 гэтага Закона.

3. Актуальныя персанальныя даныя, якія ўносяцца ў рэгістр, сведчацца электронным лічбавым подпісам упаўнаважанага работніка дзяржаўнай арганізацыі, якая іх уносіць.

4. Пры актуалізацыі персанальных даных у запісе ў рэгістры робяцца наступныя адзнакі:

4.1. дата і час актуалізацыі персанальных даных;

4.2. назва дзяржаўнай арганізацыі, якая ўнесла актуальныя персанальныя даныя ў рэгістр.

5. Пры актуалізацыі персанальных даных новыя персанальныя даныя ўносяцца без знішчэння папярэдніх.

6. Пры выяўленні недакладнасцяў у персанальных даных распарадчык рэгістра накіроўвае запыт у дзяржаўную арганізацыю, якой былі ўнесены персанальныя даныя ў рэгістр, для праверкі іх дакладнасці і ўнясення ў рэгістр актуальных персанальных даных.

**Артыкул 15. Выключэнне персанальных даных з рэгістра**

1. Персанальныя даныя з рэгістра выключаюцца рэгіструючай службай у выпадку парушэння ўстаноўленага гэтым Законам парадку ўнясення персанальных даных у рэгістр, а таксама ў мэтах забеспячэння нацыянальнай бяспекі, правоў і свабод фізічных асобаў.

2. Пры выключэнні персанальных даных з рэгістра ў запісе ў рэгістры робяцца наступныя адзнакі:

2.1. дата і час выключэння персанальных даных;

2.2. падстава для выключэння персанальных даных;

2.3. прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку і электронны лічбавы подпіс упаўнаважанага супрацоўніка або асобы з ліку грамадзянскага персаналу (далей — упаўнаважаны супрацоўнік) рэгіструючай службы, які выключыў персанальныя даныя.

3. Пры выключэнні персанальных даных з рэгістра яны не знішчаюцца і могуць быць прачытаны рэгіструючай службай.

**Артыкул 16. Захоўванне персанальных даных**

1. Персанальныя даныя ў рэгістры захоўваюцца на беларускай і (або) рускай мовах, а прозвішчы і ўласныя імёны таксама і ў лацінскай транскрыпцыі. Правілы трансліттарацыі прозвішча і ўласнага імя грамадзян Рэспублікі Беларусь устанаўліваюцца Міністэрствам унутраных спраў Рэспублікі Беларусь. Прозвішчы, уласныя імёны іншаземных грамадзян і асобаў без грамадзянства, якія пастаянна пражываюць у Рэспубліцы Беларусь, указваюцца ў лацінскай транскрыпцыі ў адпаведнасці з праязнымі дакументамі, якія выдадзены гэтым асобам замежнымі дзяржавамі.

2. Персанальныя даныя, якія ўтрымліваюцца ў рэгістры, захоўваюцца пастаянна. Распарадчык рэгістра забяспечвае захоўванне электронных копій рэгістра па-за памяшканнямі рэгіструючай службы і абнаўленне персанальных даных, якія ўтрымліваюцца ў копіях, не менш як адзін раз у год.

3. Перадача персанальных даных на захоўванне ў электронны архіў ажыццяўляецца ў выпадку:

3.1. смерці або аб'яўлення фізічнай асобы памерлай;

3.2. выхаду з грамадзянства або страты грамадзянства Рэспублікі Беларусь грамадзянамі Рэспублікі Беларусь, якія пастаянна пражываюць за мяжой;

3.3. выезду іншаземных грамадзян і асобаў без грамадзянства, якія пастаянна пражывалі ў Рэспубліцы Беларусь, на пастаяннае жыхарства за межы Рэспублікі Беларусь;

3.4. анулявання дазволу на пастаяннае пражыванне ў Рэспубліцы Беларусь.

4. Пры перадачы персанальных даных на захоўванне ў электронны архіў у запісе ў рэгістры робяцца наступныя адзнакі:

4.1. дата і час перадачы персанальных даных на захоўванне ў электронны архіў;

4.2. прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку і электронны лічбавы подпіс упаўнаважанага супрацоўніка рэгіструючай службы, які перадаў персанальныя даныя на захоўванне ў электронны архіў.

**Артыкул 17. Аднаўленне персанальных даных**

1. Аднаўленне персанальных даных у рэгістры ажыццяўляецца рэгіструючай службай у выпадках пашкоджання або знішчэння запісаў у рэгістры.

2. Персанальныя даныя могуць быць адноўлены цалкам або часткова на падставе персанальных даных, якія ўнесены дзяржаўнымі арганізацыямі ў адпаведнасці з артыкулам 12 гэтага Закона.

3. Пры аднаўленні персанальных даных у запісе ў рэгістры робяцца наступныя адзнакі:

3.1. дата і час аднаўлення персанальных даных;

3.2. назва дзяржаўнай арганізацыі, якая ўнесла персанальныя даныя ў рэгістр;

3.3. прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку і электронны лічбавы подпіс упаўнаважанага супрацоўніка рэгіструючай службы, які аднавіў персанальныя даныя ў рэгістры.

**Артыкул 18. Вядзенне рэгістра на электронных носьбітах. Сертыфікацыя камп'ютарных праграм і тэхнічных сродкаў для вядзення рэгістра**

1. Вядзенне рэгістра ажыццяўляецца рэгіструючай службай на электронных носьбітах.

2. Камп'ютарныя праграмы і тэхнічныя сродкі для вядзення рэгістра павінны быць сертыфікаваны ў парадку, устаноўленым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

## ГЛАВА 3
## КІРАВАННЕ РЭГІСТРАМ. ФУНКЦЫІ ДЗЯРЖАЎНЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ ПА ЗАБЕСПЯЧЭННІ ФУНКЦЫЯНАВАННЯ РЭГІСТРА

**Артыкул 19. Кіраванне рэгістрам**

Кіраванне рэгістрам ажыццяўляе распарадчык рэгістра — Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 20. Функцыі распарадчыка рэгістра**

Распарадчык рэгістра выконвае наступныя функцыі:

распрацоўвае тэхнічныя рэгламенты, звязаныя з работай рэгістра;

устанаўлівае ўзоры электронных дакументаў для вядзення рэгістра;

устанаўлівае парадак і ажыццяўляе абязлічванне персанальных даных у адпаведнасці з артыкулам 30 гэтага Закона;

забяспечвае ахову персанальных даных, якія ўтрымліваюцца ў рэгістры;

ажыццяўляе метадычнае кіраўніцтва і кантроль у межах сваёй кампетэнцыі за вядзеннем сістэм уліку асобных катэгорый фізічных асобаў, што ствараюцца дзяржаўнымі арганізацыямі, і ўзаемадзеяннем гэтых сістэм з рэгістрам;

заключае дагаворы з арганізацыямі, натарыусамі аб рэгулярным прадастаўленні ім персанальных даных з рэгістра ў парадку, устаноўленым артыкулам 24 гэтага Закона;

ажыццяўляе кантроль за вядзеннем рэгістра і выкарыстаннем персанальных даных, якія ўтрымліваюцца ў ім;

ажыццяўляе кантроль у межах сваёй кампетэнцыі за парадкам унясення дзяржаўнымі арганізацыямі, указанымі ў артыкуле 12 гэтага Закона, персанальных даных у рэгістр.

**Артыкул 21. Функцыі рэгіструючай службы**

Рэгіструючая служба выконвае наступныя функцыі:

стварае ўмовы для бесперапыннага ўнясення дзяржаўнымі арганізацыямі, указанымі ў артыкуле 12 гэтага Закона, персанальных даных у рэгістр, іх актуалізацыі, ажыццяўляе выключэнне, захоўванне, аднаўленне персанальных даных у парадку, устаноўленым гэтым Законам;

прадастаўляе персанальныя даныя, якія ўтрымліваюцца ў рэгістры, арганізацыям, натарыусам і фізічным асобам у парадку, устаноўленым гэтым Законам;

прымае меры па ахове персанальных даных, якія ўтрымліваюцца ў рэгістры.

**Артыкул 22. Функцыі іншых дзяржаўных арганізацый па забеспячэнні функцыянавання рэгістра**

1. Дзяржаўныя арганізацыі, указаныя ў артыкуле 12 гэтага Закона, у межах сваёй кампетэнцыі забяспечваюць:

1.1. стварэнне неабходнай інфраструктуры для ўнясення ў рэгістр персанальных даных;

1.2. унясенне ў рэгістр дакладных персанальных даных, іх актуалізацыю ў парадку, прадугледжаным артыкуламі 12—14 гэтага Закона;

1.3. прыняцце неабходных мераў па захоўванні і ахове персанальных даных, якія ўносяцца ў рэгістр.

2. Дзяржаўныя арганізацыі ў мэтах забеспячэння інфармацыйнага ўзаемадзеяння з рэгістрам пры стварэнні сістэм уліку асобных катэгорый фізічных асобаў павінны будаваць іх на аснове ідэнтыфікацыйнага нумара, папярэдне ўзгадніўшы праекты такіх сістэм з Міністэрствам сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь і Міністэрствам унутраных спраў Рэспублікі Беларусь.

## ГЛАВА 4
## ПРАДАСТАЎЛЕННЕ ПЕРСАНАЛЬНЫХ ДАНЫХ З РЭГІСТРА

**Артыкул 23. Прадастаўленне, адмова ў прадастаўленні персанальных даных з рэгістра**

1. Персанальныя даныя з рэгістра прадастаўляюцца арганізацыям, натарыусам і фізічным асобам у парадку і тэрміны, прадугледжаныя артыкуламі 24—28 гэтага Закона.

2. Невыкананне парадку, прадугледжанага артыкуламі 24 і 26 гэтага Закона, з'яўляецца падставай для адмовы ў прадастаўленні персанальных даных з рэгістра.

Адмова ў прадастаўленні персанальных даных з рэгістра можа быць абскарджана ў распарадчыка рэгістра.

Абскарджанне ў судовым парадку адмовы ў прадастаўленні персанальных даных з рэгістра ажыццяўляецца пасля абскарджання такой адмовы ў распарадчыка рэгістра.

3. Замежным дзяржавам, а таксама міжнародным або замежным арганізацыям персанальныя даныя, якія ўтрымліваюцца ў рэгістры, прадастаўляюцца ў адпаведнасці з міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 24. Парадак прадастаўлення персанальных даных з рэгістра арганізацыям, натарыусам**

1. Прадастаўленне персанальных даных (у тым ліку абязлічаных) з рэгістра арганізацыям, натарыусам ажыццяўляецца рэгіструючай службай бясплатна, калі выкарыстанне такіх персанальных даных неабходна для выканання задач, што ўваходзяць у кампетэнцыю гэтых арганізацый, натарыусаў, якая вызначана заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

У іншых выпадках арганізацыям, натарыусам прадастаўляюцца абязлічаныя персанальныя даныя на платнай аснове. За прадастаўленне такіх даных збіраецца дзяржаўная пошліна ў парадку і памерах, устаноўленых заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь.

2. Прадастаўленне персанальных даных з рэгістра арганізацыям, натарыусам ажыццяўляецца па пісьмовым або электронным запыце аб прадастаўленні, засведчаным у парадку, што вызначаецца Міністэрствам унутраных спраў Рэспублікі Беларусь, і (або) дагаворы аб рэгулярным прадастаўленні персанальных даных з рэгістра, заключаным у адпаведнасці з грамадзянскім заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

3. У запыце аб прадастаўленні персанальных даных з рэгістра ўказваюцца:

3.1. назва арганізацыі, арганізацыйная форма ажыццяўлення натарыяльнай дзейнасці і прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку натарыуса, якія звяртаюцца па прадастаўленне персанальных даных з рэгістра;

3.2. падставы і мэта атрымання персанальных даных;

3.3. склад і аб'ём персанальных даных, якія запытваюцца;

3.4. парадак і тэрміны выкарыстання персанальных даных.

4. У дагаворы аб рэгулярным прадастаўленні персанальных даных з рэгістра акрамя звестак, прадугледжаных пунктам 3 гэтага артыкула, таксама ўказваюцца:

4.1. форма рэгулярнага прадастаўлення персанальных даных (на папяровых носьбітах, у электронным выглядзе);

4.2. парадак і тэрміны рэгулярнага прадастаўлення персанальных даных.

**Артыкул 25. Тэрміны прадастаўлення персанальных даных з рэгістра арганізацыям, натарыусам**

1. Прадастаўленне персанальных даных з рэгістра па запыце арганізацыі ажыццяўляецца не пазней чым праз дзесяць каляндарных дзён з дня падачы такога запыту ў рэгіструючую службу альбо ў тэрміны, вызначаныя дагаворам аб рэгулярным прадастаўленні персанальных даных з рэгістра.

2. Тэрмін прадастаўлення персанальных даных з рэгістра па запыце арганізацыі можа быць падоўжаны да аднаго месяца кіраўніком (намеснікам кіраўніка) рэгіструючай службы ў выпадку, калі запыт аб прадастаўленні персанальных даных з рэгістра датычыцца вялікага аб'ёму персанальных даных, якія патрабуюць адбору.

3. Арганізацыі, якая запытвае персанальныя даныя з рэгістра, паведамляецца ў пісьмовай форме аб падаўжэнні тэрміну прадастаўлення персанальных даных з рэгістра і аб прычынах яго падаўжэння не пазней чым за тры каляндарныя дні да заканчэння тэрміну іх прадастаўлення па запыце.

4. Прадастаўленне персанальных даных з рэгістра па запыце натарыуса ажыццяўляецца не пазней чым праз два тыдні з дня атрымання запыту натарыуса аб іх прадастаўленні альбо ў тэрміны, вызначаныя дагаворам аб рэгулярным прадастаўленні персанальных даных з рэгістра.

**Артыкул 26. Парадак прадастаўлення персанальных даных з рэгістра фізічным асобам**

1. Персанальныя даныя з рэгістра прадастаўляюцца фізічным асобам рэгіструючай службай у форме даведак (выпісак).

2. Фізічная асоба мае права запытваць і атрымліваць даведкі (выпіскі) з рэгістра ў дачыненні да:

2.1. сваіх персанальных даных і персанальных даных фізічных асобаў, законным прадстаўніком якіх яна з'яўляецца;

2.2. персанальных даных іншых фізічных асобаў, законным прадстаўніком якіх яна не з'яўляецца, — з пісьмовай згоды фізічных асобаў (іх законных прадстаўнікоў), персанальныя даныя якіх запытваюцца.

3. Фізічныя асобы, якія не валодаюць грамадзянскай дзеяздольнасцю ў поўным аб'ёме, удзельнічаюць ва ўказаных адносінах праз законных прадстаўнікоў, калі іншае не ўстаноўлена заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь.

4. Даведкі (выпіскі) з рэгістра прадастаўляюцца па пісьмовай заяве фізічнай асобы аб прадастаўленні даведкі (выпіскі). Пры гэтым фізічная асоба, якая жадае атрымаць даведку (выпіску) з рэгістра, не павінна абгрунтоўваць свой інтарэс да персанальных даных, якія запытвае.

5. Форма пісьмовай заявы аб прадастаўленні персанальных даных з рэгістра вызначаецца распарадчыкам рэгістра.

6. Пісьмовая згода фізічнай асобы (яе законнага прадстаўніка), прадугледжаная падпунктам 2.2 пункта 2 гэтага артыкула, можа выражацца шляхам:

6.1. афармлення натарыяльна засведчанай даверанасці на атрыманне персанальных даных з рэгістра;

6.2. натарыяльнага засведчання сапраўднасці подпісу на заяве фізічнай асобы (яе законнага прадстаўніка) аб згодзе на атрыманне персанальных даных аб ёй з рэгістра;

6.3. засведчання ўпаўнаважаным супрацоўнікам рэгіструючай службы заявы фізічнай асобы (яе законнага прадстаўніка) аб згодзе на атрыманне персанальных даных аб ёй з рэгістра.

7. Даведкі (выпіскі) з рэгістра, якія запытваюцца фізічнай асобай адзін раз у межах каляндарнага года, прадастаўляюцца бясплатна. Прадастаўленне такіх даведак (выпісак) больш як адзін раз у межах каляндарнага года ажыццяўляецца на платнай аснове. За прадастаўленне такіх даведак (выпісак) збіраецца дзяржаўная пошліна ў парадку і памерах, устаноўленых заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь.

Перыядычнасць запытаў фізічнай асобай даведак (выпісак) у дачыненні да сваіх персанальных даных вызначаецца асобна ад перыядычнасці запытаў ёю даведак (выпісак) у дачыненні да персанальных даных фізічных асобаў, законным прадстаўніком якіх яна з'яўляецца, а таксама іншых фізічных асобаў.

**Артыкул 27. Тэрміны прадастаўлення даведак (выпісак) з рэгістра**

1. Прадастаўленне даведкі (выпіскі) з рэгістра ажыццяўляецца не пазней як праз пяць каляндарных дзён з дня падачы ў рэгіструючую службу заявы фізічнай асобы аб прадастаўленні даведкі (выпіскі) з рэгістра.

2. Тэрмін прадастаўлення даведкі (выпіскі) з рэгістра можа быць падоўжаны да пятнаццаці каляндарных дзён кіраўніком (намеснікам кіраўніка) рэгіструючай службы ў выпадку, калі заява фізічнай асобы аб прадастаўленні даведкі (выпіскі) з рэгістра датычыцца вялікага аб'ёму персанальных даных, якія патрабуюць адбору.

3. Фізічнай асобе, якая запытвае даведку (выпіску) з рэгістра, павінна быць паведамлена ў пісьмовай форме аб падаўжэнні тэрміну прадастаўлення даведкі (выпіскі) з рэгістра і аб прычынах яго падаўжэння не пазней чым за тры каляндарныя дні да заканчэння тэрміну прадастаўлення даведкі (выпіскі) з рэгістра.

**Артыкул 28. Адзнакі аб прадастаўленні (аб адмове ў прадастаўленні) персанальных даных з рэгістра арганізацыям, натарыусам, фізічным асобам**

1. Усе факты прадастаўлення персанальных даных з рэгістра фіксуюцца ўпаўнаважанымі супрацоўнікамі рэгіструючай службы і (або) спецыяльнымі праграмна-тэхнічнымі сродкамі ў рэгістры ў аўтаматычным рэжыме.

